Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэн… …ючага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к.; „ 3 „ — 2 р. 70 к.; „ 6 „ — 4 р. — к.; „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.; За радок нанпарэлі насярод тэксту 1 р. — к.; За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап.; За кожны дадатковы 15 „; Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „; За кожны дадатковы 5 „; Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

НАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 189 (2678) Серада, 21-га жніўня 1929 г.

4 пр. "Савецкая Беларусь" Одесса, Пастера 13. Госуд. публичн. библ. студ. сьнек. одзін экз.

Усе сілы на правядзеньне дню калектывізацыі.

Рабочыя і бядняцка-серадняцкая маса нашага сялянства ня толькі са дня ў дзень кладуць цаглінкі ў вялікі мур нашага сацыялістычнага будаўніцтва, але і безупынна праяўляюць сваю ініцыятыву ў адшуканьні новых, больш сталых мэтадаў нашага будаўніцтва. Не пасьпелі яшчэ рабочыя Саюзу скончыць правядзеньне, па свайму пачыну, дню індустрыялізацыі, як па многіх сёлах, вёсках і калектывах паўстала пытаньне аб неабходнасьці наладжаньня дню калектывізацыі.

Бедната, якая ў рабочай клясе бачыць свайго правадыра і кіраўніка, высунула пытаньне аб тым, што для таго, каб дабіцца больш каштоўных вынікаў у індустрыялізацыі ўсяе народнае гаспадаркі, неабходна больш шпарка калектывізаваць сельскі сэктар апошняе. Затым бедната і серадьнякі прапанавалі ўстанавіць спэцыяльны дзень, у які можна было-б мабілізаваць увагу ўсяе савецкае грамадзкасьці навокала калектывізацыі.

Цэнтральны камітэт камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, улічваючы ўсю важнасьць паднятага бядняцкім слоем вёскі пытаньня, зьвярнуўся да ўсіх камуністаў, рабочых, батракоў, сялян-беднякоў і серадьнякоў аб неабходнасьці дзень рэлігійнага сьвята „прачыстую“ (28 жніўня) абярнуць у масавы дзень калектывізацыі.

У дзень калектывізацыі трэба паднясьць усю масу бядняцка-серадняцкага сялянства ў паход супроць старых форм землякарыстаньня, супроць дзедаўскіх звычаяў у вядзеньні сельскай гаспадаркі. Дзень калектывізацыі павінен быць тым пераломным пунктам, калі селянін-бядняк і серадняк набліжаюцца да сацыялістычных форм вядзеньня гаспадаркі. У дзень калектывізацыі трэба пераарэць сталёвым трактарам вузкія палоскі вёсак і раскіданыя кускі хутароў і атрубаў на роўнае шырокае поле калектыву. Кожны селянін-бядняк і серадняк у гэты дзень павінен упэўніцца ў тым, што далейшы шлях для яго адзін і толькі адзін, гэта—камуны і арцелі.

Усю практычную работу па падрыхтоўцы да дню калектывізацыі трэба менавіта згрупаваць навокала пытаньняў пашырэньня новых калгасаў, узбуйненьня і ўзмацненьня ўжо раней арганізаваных. Трэба на мясцох скласьці такую атмасфэру і ўстанавіць такі парадак, які даваў-бы магчымасьць кожнаму бедняку, кожнаму серадняку стаць калгасьнікам. У нас яшчэ нярэдка здараецца так, што некалькі беднякоў ня могуць аб'яднацца ў калгас з тае толькі прычыны, што іх малы лік, ці часта бывае так, што зацьверджаны калгас не земляўпарадкоўваецца на некалькі месяцаў, а нават і таго больш, бывае, што бяз ніякае прычыны калгас не зацьвярджаецца. У дзень калектывізацыі ўсе гэтыя недаходы павінны быць зьнішчаны.

Сельсаветы, ячэйкі КП(б)Б і прафарганізацыі пры падрыхтоўцы дню індустрыялізацыі павінны праверыць выкананьне раней дадзеных дырэктыў партыяй і ўрадам адносна ўзмацненьня калектывізацыі; асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на згрупаваньне навокала калектываў усяе бядняцкае і серадняцкае масы для далейшага наступу на кулацкія элемэнты вёскі. Трэба склікаць адкрытыя сходы членаў камуны і арцеляў разам з батракамі, беднякамі і серадьнякамі вакольчных вёсак. Апошнія павінны азнаёміцца з работаю і дабрабытам калгасьнікаў. Тут-жа на сходах трэба зрабіць пачын у закладцы фондаў калектывізацыі, скласьці і дапоўніць вытворчыя пляны калгасаў і праверыць вынікі сацыялістычнага спаборніцтва.

У дзень калектывізацыі трэба яшчэ раз праверыць падрыхтоўку да асеньняй сяўбы, запоўніўшы ранейшыя пропускі цэлым шэрагам важнейшых мерапрыемстваў па ўзьняцьцю ўраджайнасьці.

Часу да дню калектывізацыі засталося мала, а падрыхтоўка павінна быць сталай, грунтоўнай, усебаковай. Затым патрабуецца ўжыць максымум энэргіі, максымум сканцэнтраванасьці, затым трэба кінуць усе сілы на падрыхтоўку і на правядзеньне баявога дню, дню калектывізацыі.

ГАТОВЫ ДАЦЬ АДПОР.

Белагвардзейскія і кітайскія атрады ўчыняюць наскокі на савецкую тэрыторыю.

Рабочыя і працоўнае сялянства падаюць заявы аб залічэньні ахотнікамі ў шэрагі асобай Далёка-Ўсходняй арміі.

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ ЦЬВЁРДА СТАІЦЬ НА ВАРЦЕ САВЕЦКАГА САЮЗУ.

Ад Народнага Камісарыяту па Замежных Справах.

МАСКВА. У сувязі з пачашчанымі наскокамі на тэрыторыю СССР белагвардзейскіх атрадаў, сфармаваных на кітайскай тэрыторыі, і распаўсюджаньнем кітайскаю прэсаю вестак аб нібыта меўшых месца наскоках савецкіх часьцей на кітайскае войска, Народны Камісарыят па Замежных Справах перадаў 19-га жніўня нямецкаму пасольству наступную заяву з просьбаю перадаць гэтую заяву нанкінскаму і мукдэнскаму ўрадам:

1) Ужо ў ноце ад 13-га ліпеня г. г. адносна захопу кітайскаю ўладаю Ўсходня-Кітайскай чыгункі саюзны ўрад адзначыў факт мабілізацыі і перавозкі ёю да мяжы СССР манчжурскага войска, таксама, як і згрупоўваньне на гэтай самай мяжы белагвардзейскіх атрадаў.

2) У памянёнай ноце, якая рашуча і своечасова перасьцерагала кітайскую ўладу ад далейшага злоўжываньня міралюбнасьцю саюзнага ўраду, зазначалася: „Адначасна атрыманы весткі аб згрупоўваньні ўздоўж кітайскай мяжы манчжурскага войска, якое прыведзена ў баявую гатоўнасьць і пасунута на самую мяжу. Водлуг вестак, разам з манчжурскім войскам ля мяжы СССР разьмеркаваны расейскія белагвардзейскія атрады, якія манчжурскае камандаваньне намерана перакінуць на савецкую тэрыторыю“

3) Гэтае папярэджаньне было пакінута кітайскаю ўладаю бяз увагі. Фармаваньне і ўзбройваньне белагвардзейскіх атрадаў з мэтаю наладжаньня наскокаў на прымежную варту і мірнае насельніцтва СССР адбываліся далей з яшчэ большаю інтэнсыўнасьцю, і зараз-жа пасьля разрыву адносін між СССР і Кітаем гэтыя атрады пачалі разьвіваць сваю дзейнасьць, абстрэльваючы савецкую тэрыторыю і ўчыняючы на яе непасрэдныя наскокі.

4) Прымежныя часьці доўгі час стрымліваліся ад мерапрыемстваў у адказ на кітайскія выпады, прычым у выніку такіх адносін пачасьціліся наскокі і налёты на тэрыторыю СССР, якія выклікалі страты забітымі і раненымі сярод мірнага насельніцтва СССР і чырвонаармейцаў.

5) Ніжэй падаецца шэраг фактаў абстрэлу тэрыторыі СССР і наскоку на яе з боку белагвардзейскіх атрадаў і кітайскіх часьцей: 18-га і 19-га ліпеня за 5 кілёмэтраў на поўнач ад вёскі Туры Рог узброенымі кітайцамі, якія перайшлі мяжу на рэчцы Бяленхі і ў раёне вёскі Імні былі абстраляны сапёры прыгранічнай варты СССР. 24-га ліпеня ў раёне вёскі Зарубіна ўзброенымі кітайцамі быў абстраляны савецкі гандлёвы параход „Бранта“. На страляніну кітайскіх салдат савецкая кананерка, якая плыла разам з параходам, не адказала. 24-га ліпеня а 2-й гадз. 20 хвіл. кананерская лодка „Бедната“, якая знаходзілася ля нізоўя рэчкі Сунгары была абстраляна з кітайскага боку кулямётным агнём і стрэльбамі. 9-га жніўня а 6-й гадз. на савецкай тэрыторыі за 3 кілёмэтры ад прыгранічнага знаку ў раёне вёскі Славянка, 45 кілёмэтраў на паўднёвы захад ад Уладывастоку на разьезд савецкай прыгранічнай варты быў учынены наскок кітайскім атрадам, прычым забіты начальнік савецкай прыгранічнай заставы. 10-га жніўня а 3-й гадзіне дню атрад прыгранічнай варты ля вёскі Чарнлева быў абстраляны з кітайскага боку групаю ўзброеных расійскіх белагвардзейцаў. Адбываючы нападаўшую банду белагвардзейцаў, атрад прыгранічнікаў адагнаў яе на кітайскую тэрыторыю, дзе яна была затрымана кітайскімі часьцямі. У выніку сутычкі з савецкага боку было забіта 5 і паранена 6 чалавек. 12-га жніўня а 3-й гадзіне ў раёне «8 балаганаў» (56 кілёмэтраў ніжэй ад Кацярына-Нікольску) на савецкую тэрыторыю перапраўіўся з Кітаю атрад белагвардзейцаў, які наскочыў на прыгранічны атрад і на мірнае насельніцтва. 12-га жніўня а 4-й гадзіне 30 хвілін савецкі манітар быў абстраляны з вінтовак з кітайскай тэрыторыі ў раёне, які знаходзіцца за 45 кілёмэтраў на захад ад нізоўя рэчкі Сунгары. У выніку страляніны ў адказ на кітайскі агонь і дзеяньняў высаджанага з манітара дэсанта атрад белагвардзейцаў уцёк далёка на кітайскую тэрыторыю. Ноччу перад 18 жніўня ўжо меў месца выпадак непасрэднага пераходу на савецкую тэрыторыю не белагвардзейскіх атрадаў, а рэгулярных кітайскіх часьцей, якія, у складзе палка (18 стралковы, які разьмешчан у горадзе Сантагоу) пераправіліся праз савецка-кітайскую мяжу ў раёне вёскі Палтаўскай (за 40 кілёмэтраў на паўднёвы ўсход ад станцыі Пагранічнай) і з белагвардзейскім атрадам перайшлі на нашу тэрыторыю і, абкружыўшы нашу заставу, якая знаходзіцца за 3 кілёмэтры ад мяжы (у напрамку Нікольск-Усурыйск) распачалі па ёй страляніну з вінтовак і кулямётаў. Адбіўшы наскок, чырвонаармейская часьць адагнала іх на кітайскую тэрыторыю.

6) Асобныя выпадкі пераходу кітайскай мяжы атрадамі чырвонаармейцаў мелі месца ў выніку наскоку на савецкую тэрыторыю з боку расейскіх белагвардзейскіх атрадаў і кітайскіх часьцей.

7) Наскок на савецкую тэрыторыю белагвардзейскіх атрадаў і кітайскіх часьцей, у асобку выкарыстаньне кітайскаю ўладаю белагвардзейскіх арганізацый, якія клапоцяцца толькі пра свае ўласныя мэты, стварае пагражаючыя варункі на мяжы і небясьпеку становішча, створанага ўчынкамі кітайскай улады.

Ужываючы ўсе захады да таго, каб з боку савецкіх часьцей ня было пераходу мяжы нават у асобных выпадках, савецкі ўрад лічыць, што кітайская ўлада павінна разброіць атрады белагвардзейцаў і папярэдзіць усе наскокі на савецкую тэрыторыю з боку кітайскіх часьцей. У іншым разе далейшыя непаразуменьні, выкліканыя новымі наскокамі на савецкую тэрыторыю, будуць ускладзены цалкам на адказнасьць нанкінскага і мукдэнскага ўрадаў.

Арганізуем добраахвотны асобы атрад.

Рабочыя заводу «Камунар» (гор. Менск) на лятучым мітынгу абгаварылі апошнія падзеі на УК чыгунцы, дзе мелі месца некалькі нападаў на нашу тэрыторыю. Рабочыя абураюцца правакацыйнымі ўчынкамі кітайскіх граміл і пастанаўляюць **арганізаваць добраахвотны асобы атрад, які ў кожны момант гатоў уліцца ў шэрагі асобай Далёка-Ўсходняй арміі.**

Мы, рабочыя і служачыя, завяраем свой урад, што на ўсе правакацыйныя вылазкі адкажам узьняцьцем вытворчасьці, падняцьцем працоўнай дысцыпліны і на ўсе 100 процантаў рэалізуем III пазыку індустрыялізацыі.

Гатовы выступіць на перадавыя пазіцыі

МАСКВА, 20-8. Сяляне вёскі Новагрыгор'еўскай, Тэрскай акругі, наладзілі суботнік па перавозцы хлеба на элеватар і ўсе заробленыя грошы перадалі на пабудову эскадрыльлі «Наш адказ Чан-Кай-шы».

Група рабочых мэталюргічнага заводу зьвярнулася ў Рэвалюцыйны Вайсковы Савет з хадайніцтвам аб залічэньні яе дабраахвотнікамі ў Чырвоную армію і пасылцы на перадавыя пазыцыі ў выпадку ваенных дзеяньняў.

У адказ на вылазку кітайскіх бандытаў сяляне вёскі Келер і Лейтлінг (рэспубліка немцаў Паваложжа) заснавалі магутны саўгас на абшары 4000 гэктараў.

У вёсках каля Благавешчанску на Амуры сяляне праводзяць паказальныя трывогі. З вялікім посьпехам праходзіць збор сродкаў на абарону.

Некалькі партызанаў падалі прапанову наладзіць грашовую лётарэю ТДА-Авіяхіму для пабудовы самалёту „Далёкаўсходні партызан».

БУДУЕМ ТАНКІ І САМАЛЁТЫ ДЛЯ АБАРОНЫ.

ХАРКАЎ, 20-8. Апошнія паведамленьні аб правакацыйных наскоках кітайскіх і белагвардзейскіх банд на савецкую тэрыторыю выклікалі новую хвалю абурэньня сярод працоўных Украіны. Працаўнікі судовых устаноў Запарожжа ўхвалілі пабудаваць танк „Судовы Працаўнік Украіны“ і адлічылі на гэта 1 проц. сваёй месячнай пэнсіі.

Цэнтральнае бюро пралетарскага студэнцтва зьвярнулася да ўсіх студэнтаў-практыкантаў Украіны з заклікам адлічыць аднадзённы заработак у фонд абароны краіны.

Незаможнікі Нарвітоўскай акругі будуюць самалёт „Незаможнік“ прычым кожны сябра камітэту незаможнікаў уносіць па 10 капеек.

Працаўнікі Арцёмаўскай ДПУ ўхвалілі на працягу году адлічаць 1 процант заработку ў фонд пабудовы эскадрыльлі імя Дзяржынскага.

Агульны сход чырвонаармейцаў і палітычнага складу №-скіх часьцей заявіў: «Хоць наша краіна хоча міру, але няхай ведаюць капіталісты, што Чырвоная армія ў кожны момант здолее стаць шчыльнаю сьцяною на абарону савецкай краіны“.

Агульны сход сялян вёскі Карлаўкі, Луганскай акругі, ухваліў сабраць сродкі на пабудову самалёту. Сяляне вёскі Бялаўкі, Кіеўскай акругі здаюць на пабудову самалёту першы сноп свайго ураджаю. Такую-ж пастанову ўхвалілі сяляне вёскі Рагачова гэтае-ж акругі.

* * *

ХАРКАЎ, 20-8. У Харкаўскі акрвыканкам пададзена безьліч заяў з просьбаю ад рабочай моладзі, старых партызанаў і ўдзельнікаў грамадзянскай вайны, міліцыянэраў, чыгуначнікаў, а таксама ад сялянскай моладзі. Большасьць просіць залічыць іх у **Асобную Далёка-Ўсходнюю армію.**

Штодня прыходзіць таксама шмат працоўных, асабліва моладзі з просьбаю аб залічэньні ў часьці Чырвонай арміі. Заявы прысылаюцца ня толькі з Харкаўскай, але з другіх акруг.

МАГУТНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ.

У міністэрстве замежных спраў павыбіваны шыбы.

ВАРШАВА, 19-8. У суботу ўвечары перад памяшканьнем міністэрства замежных спраў у Варшаве адбылася дэманстрацыя, наладжаная, водлуг слоў газэт, камуністамі. Дэманстранты пратэставалі супроць палітыкі абкружэньня СССР, а таксама супроць правакацыйных учынкаў кітайскіх генэралаў. У памяшканьні міністэрства замежных спраў былі павыбіваны шыбы.

Паліцыя разагнала дэманстрантаў і арыштавала 15 чалавек, якія аддаюцца пад суд згодна арт. крымінальнага кодэксу, які прадугледжвае зьвяволеньне на тэрмін да 6-ці гадоў.

Назначэньне новага камандуючага войскам.

ТОКІЁ, 19-8. Як паведамляе агенцтва Сімбун Рэнго з Мукдэну, прадстаўнік нанкінскага штабу Лю-Гуан прыехаў на станцыю Манчжурыя 18-га жніўня, аглядзеў разьмеркаваньне войск і ў гэты-ж дзень выехаў у Шандунь.

Далей паведамляецца, што камандуючым франтовым войскам назначан генэрал Ван-Шу-Чан, які выяжджае з Мукдэну ў Харбін.

На савецкіх служачых на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы наладжваюцца формення аблавы. Арыштаван начальнік станцыі Манчжурыя і яшчэ 12 савецкіх служачых. Усе яны накіраваны ў Харбін.

Генэралы „радзяцца“.

ПЭЙПІН, 17-8. Пэйпінскі прадстаўнік Чан-Кай-Шы генэрал Хэчэнь-Чунь выехаў сёньня ў Мукдэн на нараду з Чжан-Сюэ-Лянам па пытаньні аб абароне мяжы. Чжун-Тао-Ян-Цай выехаў учора ў Мукдэн з Харбіну.

Дызэртырства павялічваецца.

ЧЫТА, 19-8. Сярод кітайскіх салдатаў марадзёрства пашыраецца. З кожным днём павялічваецца лік дызэртыраў, якія ідуць у сопкі і арганізуюць там шайкі хунхузаў. Гэтыя шайкі рабуюць насельніцтва. Сяляне на пакосах знаходзяць кінутыя кітайскімі салдатамі мундзіры і шапкі.

Гараць склады.

ХАБАРАЎСК, 18-8. Водлуг апошніх вестак з Харбіну, на чыгунцы пануе поўны развал, прычым крушэньні паяздоў здараюцца штодня. На некаторых станцыях гараць склады.

Бясчынствы кітайскай улады над савецкімі служачымі чыгункі ўсё больш павялічваюцца. Арыштаваных зьбіваюць прыкладамі, савецкія служачыя пакідаюць працу. Чыгуначнае дэпо ў Харбіне перапоўнена салдатамі і паліцыяй, праўленьне і службы чыгункі абернута ў паліцэйскія лягеры. Каб трапіць у праўленьне, трэба прайсьці падвойны кантроль.

Мукдэнскае камандаваньне ня спыняе перакідваць войска і засноўваць белагвардзейскія атрады. Учора ў напрамку на Манчжурыю паслана некалькі вайсковых эшалонаў. Дэзэртырства кітайскіх салдат ня спыняецца.

Лёсам УК чыгункі „цікавяцца“.

ПАРЫЖ, 19-8. Французскі друк ня спыняе ўдзяляць шмат увагі і месца весткам аб савецка-кітайскім канфлікце. Газэты зьмяшчаюць паведамленьні, пераважна з Лёндану, Нанкіну і Пэйпіну. Вельмі характэрна, што орган сацыялістаў «Популер», ня спыняе патрабаваць умешваньня дзяржаў у канфлікт і заяўляе: «Той з бакоў, які адмовіўся-б ад пасрэдніцтва дзяржаў, паказаўся-б пужлівым». Буржуазная газэта «Катыд'ен» падкрэсьлівае, што «лёсам Усходня-Кітайскай чыгункі зацікаўлены значныя эўрапейскія капіталы».

Зьдзекі і арышты ня спыняюцца.

ЧЫТА, 19-8. На ст. Пагранічная кітайскай паліцыяй арыштавана яшчэ 82 савецкіх гр-н—рабочыя У.-К. чыгункі. Большасьць з іх накіраваны ў Харбін.

На ст. Мулін арыштавана 72 чал. Большасьць з іх служачыя службы цягі на У.-К. чыгунцы. Арыштаваных зьбівалі і зьвязвалі дротам.

* *

ТОКІЁ, 20-8. Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе: „Водлуг вестак з Харбіну, 39 савецкіх грамадзян, аб якіх паведамлялася 16 жніўня, абвясьцілі галадоўку. Гэта было зроблена пасьля ўмешваньня прадстаўніка нямецкага консульства Штобэ, які дамогся ад пракурора кітайскага вярхоўнага суду заявы, што справа савецкіх грамадзян будзе разглядацца праз тыдзень.

Усе савецкія грамадзяне, пра якіх ідзе гутарка, змораны трохмесячным зьняволеньнем, а галадоўка яшчэ больш пагоршыла іх стан. Трое пераведзена ў шпіталь.

Склады і цяплушкі абернуты ў турмы.

ТОКІЁ, 18-8. Як паведамляюць з Харбіну ад 16 жніўня, абвясьціўшыя галадоўку 39 арыштаваных патрабуюць неадкладнага вызваленьня. Памочнік пракурора, які наведаў іх у астрозе, абяцаў паскорыць разгляд справы.

З прычыны недахвату астрогаў, якія ня могуць зьмясьціць некалькі тысяч арыштаваных савецкіх грамадзян, кітайская ўлада для гэтага падрыхтавала шмат чыгуначных складаў і цяплушак.

На ўдар—ударам.

Расейскія белагвардзейцы пязьменна карысталіся ўсямерным падтрыманьнем кітайскае ўлады. Мукдэнскія генэралы бачылі ў гэтых адкідах сваіх адданых саюзьнікаў у барацьбе з савецкім урадам і старанных агентаў у бязупынных прасьледаваньнях і прыгнечаньнях савецкіх грамадзян. Расейскія белагвардзейцы запоўнілі кітайскую паліцыю, жандармэрыю і ахранку. Яны працуюць у якасьці інструктароў і рабочых у мукдэнскім арсэнале.

З гэтых адшчапенцаў зфармаваў прагрымеўшы сваімі зьверствамі па ўвесь Кітай былы генэрал-губэрнатар Шандуня Чжан-Цзу-чан свае белагвардзейскія часьці „нечаяўцаў“, якія праславіліся нячуванымі гвалтамі і рабункамі мірнага насельніцтва. У Харбіне адкрыта працавалі розныя фашысцкія арганізацыі, выступаўшы з прапагандай тэрарыстычных актаў супроць савецкіх працаўнікоў і ў сваіх друкаваных выданьнях праслаўлялі «гэраічныя» ўчынкі Конрадзі і Кавэрды.

Разрыў адносін паміж СССР Мукдэнам і Нанкіным даў надзею белабандытам, якія пацягнуліся з усіх куткоў Кітаю да савецка-кітайскай мяжы. Ды і ня толькі Кітаю. Толькі гэтымі днямі японская прэса паведаміла аб выезьдзе з Парыжу ў Токіё белых афіцэраў з мэтаю ўдзельнічаць у ваенных выступленьнях супроць СССР.

Яшчэ ў ноце ад 13 ліпеня адносна захопу УК чыгункі савецкі ўрад рашуча перасьцерагаў Мукдэн супроць распачатай імі арганізацыі ўзбраеньняў белабандыцкіх атрадаў да мяжы. Перасьцярога не зрабіла ніякага ўплыву на кітайскую ўладу, якая разам з белагвардзейцамі пачала ажыцьцяўляць свае анты-савецкія пляны, кітайская ўлада не магла і не жадала адмовіць у зброі і падтрыманьні тым, хто зьявіўся іх верным саюзьнікам у захопе УК чыгункі, замяшчаючы зволненых і кідаючых працу савецкіх грамадзян і ўзяўшы на сябе галоўную ролю па разгрому рабочых арганізацый і стварэньню рэжыму крывавага тэрору ў адносіне да ўсіх савецкіх рабочых і служачых.

Дзесяткі сфармаваных і ўзброеных белагвардзейскіх атрадаў занялі пазіцыі ўздоўж савецка-кітайскай мяжы, спадзяючыся абрабаваць мірнае насельніцтва і ўчыніць напад зьнянацку на нашы часьці.

Актыўнасьць гэтых шаяк павялічвалася з кожным днём, і ў выніку яе зьявілася шмат забітых і параненых як сярод нашых чырвонаармейцаў, так і мірнага прыгранічнага насельніцтва.

Аднак, наглыя замахі белагвардзейскіх і кітайскіх бандытаў на савецкую мяжу сустрэлі своечасовы і рашучы адпор. Шмат разоў пабітыя ў часе грамадзянскай вайны белагвардзейскія адкіды ізноў пакаштавалі моц чырвонаармейскага штыка. Лёс іх падзялілі і тыя кітайскія часьці, якія абапіраліся на сваіх белых саюзьнікаў і разам з імі спрабавалі напасьці на нашу варту. У асобных выпадках, дзе абстрэлы і напады на нашы часьці мелі сыстэматычны характар, нашы чырвонаармейцы былі прымушаны перайсьці на кітайскую тэрыторыю і зьнішчыць белыя гнёзды на месцы.

Нанкінскі ўрад і мукдэнская ўлада атрымалі магчымасьць пераканацца на справе, што Чырвоная армія цьвёрда стаіць на варце сваёй краіны і здолее даць належны адпор усялякім замахам звонку. Нанкін цяпер узьняў бязсаромнае выцьцё, што «савецкае войска ўварвалася ў Манчжурыю». Гэтаму агіднаму паклёпу ніхто не паверыць. Яшчэ меншае ўражаньне зробяць гэтыя крыкі на нас. Калі Нанкін і Мукдэн сапраўды адумаліся і ня хочуць ускладненьняў, няхай яны неадкладна разброяць у расьпусьцяць белагвардзейскія атрады і прымуць меры да недапушчэньня паўтарэньня новых наскокаў і нападаў на тэрыторыю СССР.

«Праўда».

У БАРАЦЬБЕ З КАПІТАЛАМ

Безпадстаўнасьць прасьледаваньня

ПАРЫЖ, 19-8. Водлуг вестак «Юманітэ», у камэрцыйным судзе адбылася нарада, на якой, згодна прапановы ўраду, абмяркоўвалася пытаньне аб абвяшчэньні рабоча-сялянскага банку некрэдытаздольным. Урад дамагаецца гэтага, не зважаючы на тое, што банк ня спыняе выплат, і не зважаючы на адсутнасьць якіх-небудзь скаргаў ці заяў з боку ўкладчыкаў.

У „Юманітэ“ зьмешчана адозва праўленьня банку, якая, абапіраючыся на лічбавыя даныя судовай экспэртызы, устанаўляе, што актыў банку перавялічвае яго пасыў. (Актыў—32 міліёны франкаў, пасыў—27 міліёнаў франкаў). Адозва выкрывае далей „антыкамуністычны характар загадаў накіраваных супроць банку, урадавых манэўраў, якія маюць на мэце зрабіць матар'яльны ўдар «Юманітэ», унітарным прафсаюзам і кампартыі“.

Буржуазея наглее.

ВЕНА. Як паведамляюць з Бухарэсту у бухарэсцкім судзе слухаўся працэс 4-х камсамольцаў. Падсудныя былі прыгавораны 2 месяцы таму назад да зьняволеньня ад 2-х да 4-х гадоў за распаўсюджваньне камуністычнай літаратуры і органу комсамолу «Тапарул Луптанар» у дзень 1-га мая. Гэты прыгавар яны спаткалі тагды выгукамі: «Няхай жыве кампартыя, няхай жыве Камінтэрн, клясавая юстыцыя нас не пераможа». За гэтыя выгукі засуджаныя абвінавачаны былі ізноў на падставе закону аб абароне дзяржавы.

Згодна новага абвінавачаньня падсудныя прыгавораны дадаткова на 1 год.

НАПЯРЭДАДНІ ЗАБАСТОЎКІ.

ЛЁНДАН, 19-8. У Брынамэнс (Паўднёвы Уэльс) уласьнікі капальняў заявілі, што намераны зьнізіць заработак на 12 з паловаю процантаў. Капальнікі не згадзіліся на гэтае зьніжэньне. Чакаецца забастоўка.

Пратэст супроць рэпрэсій.

ВЕНА. Як паведамляюць з Кішынёву, у рабочых кварталах гораду распаўсюджаны і расклеены на сьценках камуністычныя адозвы з пратэстам супроць рэпрэсій 1-га жніўня.

Вызвален пад заклад!

ВАРШАВА, 19-8. Дэпутат Сельробу Вайніцкі, арыштаваны ў Львове перад днём 1-га жніўня, вызвален пад заклад.

БОЙКА ФАШЫСТАЎ З ЭСДЭКАМІ

ВЕНА, 19-8. У Сэнт-Лёрэнцы (правінцыя Штырыя) здарылася крывавая сутычка між сацыял-дэмакратычным „саюзам рэспубліканскай абароны“ і фішысцкай арганізацыяй. Забіт адзін сацыял-дэмакрат і цяжка паранена 3 фашысты і 6 сацыял-дэмакратаў; лёгка паранена 60 чалавек з абодвых бакоў.

* * *

ВЕНА, 19-8. Водлуг вестак газэт, лік параненых у часе сутычак хэймвэру (фашыстаў) з сацыял-дэмакратамі ў Сэнт-Лёрэнцы (правінцыя Штырыя) дасягае 150—200 чалавек. Ноччу ад ран памерла яшчэ двое сацыял-дэмакратаў. Вакзалы, дзяржаўныя прадпрыемствы і грамадзкія ўстановы Вены вартуюцца ўзмоцненымі атрадамі паліцыі. На некаторых прадпрыемствах Вены рабочыя стыхійна кідалі 19-га жніўня працу на паўгадзіны—гадзіну. Газэты патрабуюць неадкладнага разброеньня арганізацый самаабароны ў інтарэсах „аўтарытэту дзяржаўнай улады і рэжыму“.

Афіцыйная „Рэйхпост“ заяўляе, што рух хэймвэраў «мае глыбокія карэньні ў народзе», з прычыны чаго яго нібыта нельга забараніць. Водлуг паведамленьня аўстрыйскага тэлеграфнага агенцтва, пасьля сутычак у Сэнт-Лёрэнцы ў больніцу было дастаўлена 67 параненых, з іх 30—цяжка.

Новая група дэлегатаў з Польшчы.

МАСКВА. Гэтымі днямі ў Маскву прыехала новая група дэлегатаў з Польшчы. Прыехалі таксама дэлегаты рабочых-эмігрантаў з Францыі, Бэльгіі і Нямеччыны. Сярод дэлегатаў ёсьць прадстаўнікі Заходняй Украіны і Пазнані. Дэлегаты наведалі Парк Культуры і адпачынку, прысутнічалі на адчыненьні Ўсесаюзнага зьлёту піанэраў, азнаёміліся з некаторымі культурнымі ўстановамі Масквы. Пасьля азнаямленьня з Масквою дэлегаты выедуць у розныя раёны СССР.

* *

АРЦЁМАЎСК, 19-8. У Гарлоўку прыехала група дэлегатаў рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Дэлегатаў сустракалі прадстаўнікі некалькіх арганізацый і рабочыя. Дэлегаты наведалі машынабудаўнічы завод, дзе адбыўся шматлюдны лятучы мітынг. Прамовы дэлегатаў былі пакрыты громам воплескаў і выгукамі: „Няхай жыве міжнародная салідарнасьць працоўных“.

* *

УЛАДЫКАЎКАЗ, 19-8. Праездам у Тыфліс прыехала на чале з тав. Ланцуцкім дэлегацыя польскіх рабочых і сялян. На пляцу Волі адбыўся шматлікі мітынг.

Тав. Ланцуцкі, спатканы нясьціхнымі воплескамі і выгукамі „ура“, расказаў аб цяжкім становішчы працоўных Польшчы. Пасьля мітынгу дэлегаты наведалі вайсковыя часьці і гутарылі з сялянамі-асятынамі і тунгусамі. З Уладыкаўказу дэлегацыя выяжджае ў Тыфліс.

У Саюзных Рэспубліках.

Забясьпечыць належны сацыяльны склад.

МАСКВА, ЦК УсеКП(б) ухваліў пастанову, якая прадугледжвае шэраг мерапрыемстваў у галіне НК Асьветы і НК Аховы Здароўя саюзных рэспублік з мэтаю забясьпечыць належны сацыяльны склад слухачоў якія будуць залічаны ў тэхнікумы і ВНУ ў 1929 г. Бюро фракцыі УЦСПС даручана арганізаваць камісію па ўцягненьні ў ВТНУ рабочых і работніц, асабліва практыкаў, якія працуюць на фабрычна-заводзкіх прадпрыемствах.

Помнік „Перакоп“.

МАСКВА. У сувязі з 10-мі ўгодкамі 31-й Перакопскай страявой дывізіі Рэвалюцыйны Вайсковы Савет СССР хадайнічае перад урадам аб пабудове помніку „Перакоп“. Ажыцьцяўленьне пабудовы помніку намячаецца ў бліжэйшую пяцігодку.

Новая крыніца нафты

ЛЕНІНГРАД, 19-8. У Кубана-Чарнаморскім раёне блізка Ільскай сталіцы ў часе працы знойдзены месцарод нафты, якая знаходзіцца на глыбіні 67 мэтраў ў ракушачным пяску.

БУДУЕМ НОВЫЯ ЗАВОДЫ.

ЛЕНІНГРАД, 19-8. Зачынілася сэсія „Гіпромез'у“. Сэсія разглядзела 12 праэктаў, з іх 5 па пашырэньню заводу „Красный Путиловец“. Асабліва шмат увагі аддала сэсія пытаньням пабудовы двух заводаў: мэталёва-алюмінёвага на Дняпры і нікелевага на Урале. Абодвы праэкты ўхвалены з вялікім пашырэньнем вытворчасьці. Нікелевы завод які будзе будавацца на сярэднім Урале і карыстацца сыравінай мясцовых капальняў, замест мяркаванага гадавога выпуску ў 1000 тон, будзе выпушчаць каля 3000 тон. Дагэтуль лічылі, што гэткай колькасьці сыравіны ў нас няма, але новымі разьведкамі высьветлена, што сыравіны будзе дастаткова.

Праэкт пабудовы алюміневага заводу на Дняпры зацьверджаны таксама з пашыраным выпускам прадукцыі замест 10000 тон на 15000 тон. Хоць алюміневы завод будзе карыстацца кушгінскімі баксітамі, але разьлік паказаў, што абсталяваць яго выгадней за ўсё ў раёне Дняпрабуду, бо гэты завод патрабуе вялізарнай колькасьці энэргіі. Вопытны алюміневы завод будзе пабудаваны ў Ленінградзкай вобласьці.

Фонд санітарнай абароны.

МАСКВА, 19-8. Цэнтральны камітэт расейскага таварыства Чырвонага Крыжу параішу арганізаваць фонд санітарнай абароны для пабудаваньня санітарных паяздоў. Першы санітарны поезд будзе месьці ў сваім складзе лазьню-пральню.

Прэзыдыум расейскага таварыства Чырвонага Крыжу паклаў аснову гэтаму фонду, асыгнаваўшы 25000 р.

Спаборніцтва двух рэспублік.

ПАКРОЎСК, 19-8. Рэспубліка немцаў Паваложжа прыняла выклік Якуцкай рэспублікі на спаборніцтва па лепшым распаўсюджаньні 3 пазыкі індустрыялізацыі. Прынята абавязацельства распаўсюдзіць 3 пазыку на 35 проц. больш за заданьне.

ТВАРАМ ДА КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРАК

28 ЖНІЎНЯ—ДЗЕНЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

ПРОЦІ ХУТАРУ, ВОТРУБУ І ДРОБНАГА ПАСЁЛКУ--ЗА БУЙНЫЯ КАЛГАСЫ

Гутарка з старшынёй Белкалгассаюзу т. Сьмірновым.

Расьце сацыялістычная вёска.

Шпаркі тэмп калектывізацыі беларускіх вёсак пачаў разгортвацца яшчэ з 1927-28 г. Гэты год даў прырост калгасаў на 126 проц., супроць таго што было з організавана да гэтага часу. Так у 1927 г. было—440 калгасаў, а ў 1928 г.—944.

У 1928-29 г. калектывізацыя разгарнулася яшчэ больш шпарка. Калі вытворчым плянам было прадугледжана калектывізацыя 52800 гэктараў зямельнай плошчы і організацыі 360 калгасаў з сярэдняй плошчаю кожнага ў 140 гэктараў, дык папярэднія весткі ў справаздачы па вясеньняй пасяўной кампаніі даюць лічбу калектывізацыі—84 тысячы гэктараў зямельнай плошчы і організацыі 570 калгасаў, сярэдняя плошча якіх складае 135,5 гэктара. З гэтай плошчы 6650 гэктараў далучана да існаваўшых дробных калгасаў.

Зараз узмацніўся тэмп організацыі больш буйных калгасаў. Так у Бабруйшчыне сярэдняя плошча землеўпарадкаваных калгасаў складае каля 400 гэктараў. І калі Бабруйшчыне было заданьне калектывізаваць у гэтым годзе па пляну—9 тысяч гэктараў дык на 15 лютага ўжо калектывізавана 25 тысяч гэктараў, што складае павялічэньне на 280 проц.

Такі-ж тэмп калектывізацыі назіраецца ва ўсіх акругах Беларусі.

Выканаем пляны 5-годкі.

Усе гатыя дасягненьні зьяўляюцца недастатковымі ў параўнаньні з тым, што трэба зрабіць для таго каб выканаць плян 5-годкі і каб калектывізацыю накіраваць па пляну разьвіцьця больш буйных калгасаў.

У гэтым годзе таксама ёсьць некаторы пачатак працы па арганізацыі буйных і ўзбуйненьня існуючых калгасаў, але гэта праца яшчэ не разгарнулася ў досыць шырокім размеры і зьяўляецца зусім недастатковай.

У гэтым годзе ўзбуйнена толькі 73 калгасы з плошчаю 6650 гэктараў, у той час калі толькі ў адным 1927-28 годзе арганізавалася дробных калгасаў у 65 гэктараў кожны. Перад апошнімі павінна быць пастаўлена задача—хутчэйшага ўзбуйненьня, бо яны ніякай пэрспэктывы на разьвіцьцё ня маюць.

У наступным 1929-30 годзе плян прадугледжвае калектывізацыю ня менш 500 тысяч гэктараў, што дае павялічэньне амаль што ў 2 разы супроць таго, што калектывізавана за ўсе гады.

Пабудаваць новую вёску.

У час правядзеньня дню калектывізацыі трэба шырока разгарнуць працу на ўзбуйненьні дробных і павялічэньні ліку больш буйных калгасаў.

У сучасны момант адным з галоўнейшых мерапрыемстваў павінен быць агляд бедняцка-серадняцкім сялянствам калгасаў, шляхам арганізацыі масавых экскурсіяў у калгасы, бо кулацтва вядзе шалёную агітацыю супроць калектывізацыі і распаўсюджвае ўсялякую бязглуздзіцу на калгасы.

Ёсьць шмат вёсак і пасёлкаў, дзе бедната і серадняцтва вельмі мала азнаёмлены з калектывізацыяй. Дзень калектывізацыі павінен зьявіцца днём калі асноўнай бедняцка-серадняцкай часткі сялянства трэба растлумачыць сутнасьць калектывізацыі, выкрываючы ўсе тыя плёткі, якія маюцца з боку кулацтва.

Калгасы, асабліва эканамічна моцныя, павінны аказваць арганізаваную дапамогу беднаце ў вёсцы (уборка ўраджаяў, запашка пасеваў і г. д.).

Гэта паслужыць далейшаму замацаваньню і сувязі калгасьнікаў з бядняцкаю часткаю вёскі, а таксама азнаёміць іх з самай сутнасьцю калектывізацыі.

Гэта адначасова будзе штурхачом да ўцягненьня ў калгасы бедняцка-серадняцкага сялянства.

Чарговыя задачы дню.

Побач з гэтымі задачамі трэба правесьці шырокую работу па падпісцы калгасьнікаў на 3 пазыку. Кампанія павінна праводзіцца пад лёзунгам «ніводнага калгасу, ніводнага калгасьніка без аблігацыі 3 пазыкі».

Апрача таго, неабходна правесьці адначасовыя адлічэньні, правядзеньні суботнікаў у фонд індустрыялізацыі краіны.

Трэба мабілізаваць увагу вясковых пралетарыяў на арганізацыю масавай здачы хлеба. Калгасы павінны быць у перадавых шэрагах.

Дзень калектывізацыі павінен быць таксама днём масавай праверкі сацыялістычных спаборніцтваў і далейшага яго разгортваньня.

Трэба змагацца за поўнае выкананьне ўсіх плянавых заданьняў, за павялічэньне ўраджайнасьці і ўзбуйненьне калгасаў, падпісцы на пазыкі, своечасовую здачу дзяржаве збожжа, за датэрміновую здачу с.-г. падатку, за паляпшэньне культурнай працы.

28 жніўня—дзень калектывізацыі ў БССР павінен стаць днём узмацненьня тэмпу калектывізацыі вёскі.

Ма.

Дзень калектывізацыі—дзень праверкі нашае працы.

ЦК саюзу сельгаслесрабочых чынна рыхтуецца да дню калектывізацыі. У гэты дзень усе саюзныя арганізацыі павінны ня толькі шырока і актыўна разгарнуць усе свае сілы па ўзмацненьню тэмпа калектывізацыі і індустрыялізацыі краіны, але гэты дзень павінен паслужыць праверкай працы па падняцьцю ўраджайнасьці па выкананьню абавязацельстваў па сацыялістычнаму спаборніцтву і г. д.

Тыя савгасы, якія падпісалі дагаворы на спаборніцтва з суседнімі савгасамі, калгасамі, вёскамі, пасёлкамі павінны абавязкова правесьці ўзаемную праверку выкананьня дагавору па спаборніцтву, шляхам узаемнае справаздачы на аб'яднаных вытворчых канфэрэнцыях, сходах і шляхам узаемнай пасылкі брыгад для праверкі выкананьня дагавору.

Трэба таксама ўнутры савгасаў арганізаваць агляд работы вытворчых нарад і праверыць выкананьня іх пастаноў.

У дзень калектывізацыі трэба шырока разгарнуць кампанію за хлебазагатоўкі, за актыўнае распаўсюджваньне 3-й пазыкі індустрыялізацыі, за своечасовую здачу с.-г. падатку. Усе савгасы і лясьніцтвы абавязкова павінны залажыць гэктары індустрыялізацыі, ураджай з якіх будзе паступаць у фонд індустрыялізацыі. Апрача таго, саюзныя арганізацыі павінны ўзяць на сабе ініцыятыву па арганізацыі такіх гэктараў па вёсках, якія павінны быць абавязкова засеяны жытам сёлета-ж.

Перад тымі савгасамі, якія да гэтага часу не заключылі дагавору на сацыялістычнае спаборніцтва, ставіцца зараз заданьне заключыць такое спаборніцтва на павялічэньне ўраджайнасьці, пашырэньне плошчы пасеваў, павялічэньне буйнай і дробнай жывёлы.

Дзень калектывізацыі павінен прайсьці пад лёзунгам дапамогі беднаце. Сельскія савгаскія рабкомы будуць арганізоўваць з батракоў і рабочых савгасаў дружыны, якія будуць дапамагаць беднаце ўбіраць з палёў і засяваць азіміну.

Рыхтуемся да дню калектывізацыі.

(Ад нашага карэспандэнта).

Віцебская акруга, у прыватнасьці Акркалгассаюз, актыўна рыхтуецца да правядзеньня Дню калектывізацыі.

Удзел у падрыхтоўцы прымаюць усе гарадзкія і вясковыя грамадзкія арганізацыі, савгасы, партыйныя і камсамольскія ячэйкі і вясковы актыў.

У Дзень калектывізацыі ў акрузе будзе арганізавана тры буйных новых калгасы: у Сіроцінскім, Лёзьнянскім і Сеньнінскім раёнах.

Звыш гэтага ва ўсіх раёнах акругі будуць арганізаваны звычайныя калгасы ў колькасьці сарака васьмі. Многія з існуючых калгасаў будуць узбуйнены за кошт вакольнага бядняцкага і серадняцкага сялянства, а некаторыя будуць пераведзены ў вышэйшыя формы калгасаў.

У Віцебскім, Бешанковіцкім і Сіроцінскім райнах будуць арганізаваны кустовыя аб'яднаньні.

У Дзень калектывізацыі ў калгасах будуць праведзены агульныя сходкі калгасьнікаў з удзелам беднаты і серадняцтва вакольных вёсак.

На гэтых сходках будуць вынесены пастановы па пытаньням: распрацоўкі інструкцый унутранага распарадку ў калгасах, стварэньня фонду калектывізацыі шляхам адлічэньняў ад заробку на кааперыраваньне беднаты, аб'яднаньне ўсіх сродкаў вытворчасьці, ахапленьне кожнай сям'ёй калгасаў падпіскай на 3 пазыку індустрыялізацыі, здачы таварных зьлішкаў загатавіцелям, датэрміновай здачы падатку' аказаньні дапамогі беднаце, выкананьні аграмінімуму, павялічэньні недзялімых капіталаў, папаўненьні паявых узносаў, зьберажэньні сродкаў самімі калгасьнікамі шляхам пералічэньня іх у ўклады і дачы заявак на сродкі вытворчасьці.

Усе калгасы да гэтага ўжо падрыхтаваны і ў Дзень калектывізацыі будзе зроблена толькі афармленьне пакон правядзеньня ў жыцьцё гэтых пытаньняў.

Будзе ўведзена шматпольле там, дзе яго яшчэ ня было, кожнаму калгасу будзе складзена табліца севазвароту новыя калгасы будуць аформлены да дню калектывізацыі.

Акркалгассаюз зьвярнуўся з таварыскім лістом да ўсіх аграномаў з просьбай прыняць шэфства над тым ці іншым калгасам, якое будзе заключацца ў аказаньні падшэфнаму калгасу ўсебаковай аграномічнай дапамогі. Шэфства будзе аформлена ў Дзень калектывізацыі.

Рыхтуюцца да Дню калектывізацыі і сельсаветы.

Працу па калектывізацыі яны ўключаюць у агульны плян працы сельсаветаў і намячаюць тыя пункты, дзе патрэбна арганізаваць калгас і дзе для гэтага маецца глеба.

Такім чынам, Дзень калектывізацыі ў Віцебшчыне дасьць пашырэньне калектывізацыі вёскі і зьявіцца першым ударам па хутарскай сыстэме землякарыстаньня, якая моцна трымае ў сваіх лапах сялянства Віцебшчыны.

Віцебск. А. Калюжны.

КАЛГАСЫ ПЕРАВОДЗЯЦЬ СЕЛЬСКУЮ ГАСП. НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ РЭЙКІ

Капыльская бедната перамагла.

(Капыльскі райён, Менскай акругі).

Больш двух год цягнулася ў Капылі справа з землеўпарадкаваньнем. Больш двух год капыльскія заможнікі зрывалі гэтую справу. Яны ўсімі сіламі стараліся абгаварыць беднату, яны запэўнялі, што на пасёлках і колектывах будуць душыць рознымі падаткамі і што там куды горш будзе жыць, чым на сваёй уласнай зямлі. Заможнікі да таго наагітавалі беднату, што з вялікімі цяжкасьцямі ўдавалася склікаць сходы. Кулакі на агульных сходах выступалі і заяўлялі:

— Нам землеўпарадкаваньне непатрэбна і на пасёлкі ніхто ня пойдзе. Але бедната на прыкладах жыцьця другіх пасёлкаў пераканалася, што падняць ураджайнасьць, палепшыць сваё становішча можна толькі калектыўна.

РАЗЛУЧАЮЦЦА З МАЕМАСЬЦЮ І ЖОНКАМІ.

Мары заможнікаў сарваць землеўпарадкаваньне не знайшлі ніякае падтрымкі з боку беднаты. Справа землеўпарадкаваньня ідзе сваею чаргою і падыходзіць к канцу. Заможнікі бачаць, што яны правалілі, што ім прыдзецца пакінуць сваю зямлю, кінуліся ў другі бок. Каб застацца на месцы, заможнікі пачалі зьбываць скаціну каб стаць беднякамі, пачалі разводзіцца з жонкамі і падрабляць дакуманты аб даўгох.

ХТО ГЭТЫЯ „БЕДНЯЧКІ“

Малюкевіч Павел мае ўласную хату, сам майстар, гаспадарка ў яго як падсобны заработак, жонка краўчыха, трымае працаўніц. Апрача гэтага Малюковіч узяў развод з жонкаю, прадаў каня і на сходзе крычыць:

— Як я буду высяляцца калі я адзін, няма каня я бедняк. Паміж іншым Малюковіч зьяўляецца нам. старшыні мястэчковага савету.

Чарнушэвіч Нестар — мае дзьве ўласныя хаты, адну зусім мовую, але каб застацца на месцы як бедняк, прадаў каня і крычыць: „Я бедняк, я ня маю каня, як я буду перасяляцца“. Апрача гэтага, Чарнушэвіч падрабіў дакуманты, у якіх павялічыў суму даўгоў. Заможнікі на гэтым ня спыняюцца.

ЯНЫ ГОСТРАЦЬ СВАЕ ЗУБЫ.

Усе спробы заможнікаў сарваць землеўпарадкаваньне, справацыраваць беднату на зрыў землеўпарадкаваньня, праваліліся. Ні крык на сходах, ні ўгаварваньне асобных сялян не памагло. Заможнікі актыўным удзельнікам землеўпарадкаваньня, пачалі пісаць ананімныя лісты аб забойстве. Гэткага зьместу быў напісан і падкінут ліст актыўнаму, грамадзкаму працаўніку т. Шацілу. Заможнікі гостраць зубы на беднату, але яны пакусаюць імі сябе.

УПАЎНАВАЖАНЫ Ў РОЛІ ПАДЛІЗЬНІКА.

Хмялеўскі Рыгор Іванаў якім-та чынам прабраўся ў упаўнаважаныя і гэтым хацеў падмазацца да беднаты і застацца на месцы, як бедняк. На сходзе ўпаўнаважаных гэты „беднячок“ пры абгаварэньні пытаньня аб размеркаваньні пасёлкаў, прасіў землеўпарадкаўчую камісію:

— Я думаю, што мы ўсе свае і вы мяне не пакрыўдзіце, а дасьце лепшы пасёлак. Хмялеўскі зрабіўся „беднячком“, каб ашукаць камісію і ўсю беднату, але яму гэта ня ўдалося. Бедната не забылася яго ранейшых выкрыкаў і нагавораў.

НАВОШТА СКАРДЗІЦЦА БЕДНАТА?

Яна скардзіцца, што камісія пры разьбіўцы на пасёлкі няправільна падышла да гэтага пытаньня. Бедняк які жыве поруч з заможнікам павінен высяляцца, а заможнік застаецца на месцы. Як прыклад возьмем вурочышча „Русанкі“. Заможніка Татарынчыка Міхаіла застаўляюць на месцы, а бедняка, які па матар'яльнаму становішчу ні ў якім разе ня можа перасяляцца, яго перасяляюць. Калі я ў аднаго райённага працаўніка запытаўся як гэта яно вышла дык ён мне адказаў:

— Бачыце Татарынчык жыве ў канцы мястэчка ўсяроўна як і на пасёлку, дык навошта яго турбаваць.

Цікава ведаць, ці лічылася камісія з матар'яльным становішчам беднаты і заможнікам Татарынчыкам? Выходзіць, што не. Для іх мэтазгодней высяляць бедняка, а пакінуць заможніка, бо ў заможніка шмат маемасьці як-жа ён яе будзе перавозіць.

ДВА, АЛЕ НЯЛЮДЗКІЯ.

Пры землеўпарадкаваньні Капыль разьбіты на адзінаццаць пасёлкаў і організавана два каляктывы «Усход» і „Чырвоны Травень“.

Калектыў „Усход“ організаваўся з 16 заможных гаспадарак і аднае бядняцкае. (Адна бядняцкая за тым, што заможнікі ў калектыў беднаты не прымаюць). Усяго пад калектывам занята 136 гэктараў зямлі з якіх: 78 гкт. адведзена пад пахаць і 45 гэктараў пад сенажаць.

Пры арганізацыі гэтага калектыву пытаньне аб ім стаяла ў райкоме партыі і цікава чаму райком даў згоду на яго арганізацыю. Паміж іншым колектыў арганізаваўся з заможнікаў-сваякоў. Бедната ў гэтакія калектывы адмаўляецца ісьці, кажучы, што з нас будуць зьдзеквацца.

Калектыў «Чырвоны травень» арганізаваўся з 5-ці бядняцкіх гаспадарак на плошчы звыш сямідзесяці гэктарах. Каляктыў зусім маленькі, яго трэба папоўніць і падтрымаць.

Справа землеўпарадкаваньня ў Капылі падыходзіць к канцу, а моцных прыкладных каляктываў у Капылі няма.

Партыйным, камсамольскім арганізацыям на справу каляктывізацыі неабходна зьвярнуць больш увагі, больш практычнае работы для справы каляктывізацыі.

В. Туравец.

Калектыў дае прыклад сялянам.

(Старобінскі райён, Бабруйскай акругі).

Сяляне вёскі Чапялі яскрава зразумелі вялікую карысьць каляктыву, у якім можна падняць гаспадарку на высокую ступень, чаго ня можна зрабіць у асобнай гаспадарцы.

Пры правядзеньні землеўпарадкаваньня яны паставілі пытаньне аб арганізацыі каляктыву. Каляктыў арганізавалі, куды ўступіла 56 сем'яў і 5 адзіночак на плошчу ў 172,14 гэктараў зямлі.

З першых дзён каляктыўцы распачалі добрую працу. Ад добрай карысных працы, добрыя і вынікі. Пры добрым доглядзе кароў яны даюць не па 3 літры малака, як сялянскія, а па 8 літраў. Усяго маецца 63 каровы, усе яны даюць каля 500 літраў малака ў дзень. Для перагонкі малака маецца ў калектыве сэпаратар. У полі ўжо гудзіць сталёны трактар, замест каня з сошкаю і жнеярка замест сярпа. Шмат маецца і другіх сельска-гаспадарчых машын, як: малацілка, сеялка, веялка. Увогуле, каляктыў тымі прыладамі, якімі працуе асобны селянін не працуе, а працуе добраякаснымі сельска-гаспадарчымі машынамі.

Дзівяцца ўсе сяляне, што гэткая праца добрая наладзілася ў каляктыве.

Сяляне на практыцы бачаць добрыя вынікі і шмат іх жадае ўступіць у каляктыў.

Суседні.

У яўрэйскай арцелі „Акцябр“

(Полаччына)

Горад павінен ведаць вёску, ведаць новыя калектыўныя гаспадаркі, якія за апошні час пачалі разьвівацца і служыць сацыялістычным фактарам да сьветлай будучыні. У Полацку апошняе ажыцьцяўляецца на справе. Так, напрыклад, акруговае праўленьне „ОЗЕТ“ па пляну намеціла правесьці шэраг спэцыяльных экскурсій у яўрэйскія калектывы, камуны з мэтаю азнаямленьня з бытам, жыцьцём, работай апошніх.

Першая экскурсія была зроблена ў яўрэйскі калгас „Інтэрнацыянал“, на Ветрыншчыне, другая ў с.-г. арцель „Акцябр“, у якой прымала ўдзел 20 чал., галоўным чынам рабочых гораду.

Падзялюся некаторымі ўражаньнямі экскурсіі, якая прайшла пры актыўным удзеле гарадзкіх рабочых і дала добрыя вынікі для практыкі ў далейшай рабоце „ОЗЕТ“.

Выехалі.

Экскурсанты зьбіраюцца на вакзале. Надвор'е спрыяе выезду, правядзеньню экскурсіі. Прыйшло 20 чал. рабочых і служачых. Некаторыя па невядомых прычынах спазьніліся, экскурсію прапусьцілі.

Праз пяць хвілін поезд імчаў нас ад Полацку. Яго ня відаць. Робіцца ціха. Поканьне колаў парушае цішыню. Перад намі ўжо ня горад з сваімі белымі будынкамі, а зялёны лес, шырокія сялянскія палі, горы, лагчыны.

Гадзіна язды і мы на ст. Адамава. Тут трэба выходзіць. За тры кілёмэтры ад станцыі знаходзіцца яўрэйская арцель „Акцябр“, куды мы і накіроўваемся.

Сярод арцельшчыкаў.

Прыехалі ў „Акцябр“, было ўжо цёмна. Была ціхая, прыгожая ноч. Толькі ўрэдка голас лясных птушак парушаў цішыню. Арцель спала. Яе абудзілі галасы экскурсантаў. Разьмясьціліся. Палеглі.

Ноч мінула. Раніцою арцельшчыкі высыпалі на работу. Выйшлі як адзін, па званку, дружна, арганізавана. Мы пачалі распытваць аб жыцьці, быце арцелі, аб усіх дасягненьнях, недахопах. Апавядаюць з вялікай ахвотай, радуюцца прыезду таварышоў з гораду.

Вытрымкі з гісторыі.

Арцельшчыкі апавядаюць нам гісторыю „Акцябра“. Гэта ня простая гісторыя, гэта гісторыя ўпартай, цяжкай барацьбы на гаспадарчым фронце.

Арцель арганізавалася ў 1925 г. з гарадзкой яўрэйскай беднаты ў былым маёнтку абшарніка Гласка, які ваколічнымі сялянамі быў раскідан. Было шмат цяжкасьцяй, сутычак у рабоце, сяляне адносіліся недаверліва.

Зараз іншы малюнак. Арцель налічвае 12 сем'яў; зямлі 186 гэкт., сёлета будзе нарэзана яшчэ 30 гэктараў. Расьце сад на 6 дзесяцінах з 600 дрэў.

Маецца трактар „Фордзон“, жняярка, 2 сенакасілкі, 2 грэбкі, складаная малатарня, сеялка, веялка, сартыроўка, свой млын і лесапільня. Налічваецца 48 гатунковых кароў, 15 коняй.

На сходзе.

Мы падрабязна азнаёміліся з жыцьцём, працай арцелі. На другі дзень наладзілі супольны сход арцельшчыкаў і экскурсантаў. На сход прыйшлі вакольныя сяляне, якія таксама зацікаўлены разьвіцьцём, умацаваньнем арцелі.

Старшыня арцелі т. Сінякоў гаварыў аб росьце, гісторыі „Акцябра“. Слухалі ўсе ўважліва, з вялікім інтарэсам. Пасьля дакладу пачалі выступаць у спрэчках, адзначаць дасягненьні, недахопы і намячаць далейшыя шляхі, па якіх трэба будзе ісьці.

Сход прайшоў з вялікай актыўнасьцю абодвых бакоў. Там-жа быў намечаны шэраг мерапрыёмстваў далейшай працы.

Пачало вечарэць.

Рыхтуемся, сьпяшаемся да ад'езду. Трэба пасьпець да адыходзячага поезду. Арцельшчыкі разьвітваюцца з экскурсантамі. Нехта сказаў „прощай“, а рабочыя паправілі „не прощай“, а „до свиданья“, бо гэткія экскурсіі будуць наладжвацца плянава, сыстэматычна.

* * *

Трэба сказаць—гэта стойкія арцельшчыкі. На агульнай зямлі яны будуюць сваё новае жыцьцё, агульную справу. Шлях гэтага будаўніцтва, гэтай барацьбы на гаспадарчым фронце, цяжкі шлях. Ён патрабуе вялікіх цяжкасьцяй, вялікага напружаньня, добрай арганізаванасьці.

Таварышы з „Акцябра“ гэта ведаюць. Так, ведаюць і пройдуць цярпісты шлях, да лепшай будучыні.

СЬПІР. МІХАЛЬЦОЎ.

Зрываецца важнае мерапрыемства.

Камуна „Чырв.Зорка“ Полацкай акр. варашыла ў гэтым годзе перайсьці на сіласаваньне харчоў. Для гэтай мэты засеяна 2 гэктары падсонечніку. З вялікімі цяжкасьцямі камунарамі была пабудавана вежа. Усё здаецца добра. Але-ж усё гэтыя мерапрыемствы знаходзяцца ў небясьпецы бо Белмэтпром падвёў з машынай—сіласарэзкай.

У пачатку ліпеня г. г. прадстаўнік Полацкага калгассаюзу дагаварыўся з дырэктарам мэтпрому т. Фішэм аб тым, што пасьля пераводу яму (Мэтпрому) задатку, машына будзе выслана праз 3 дні. Чакаюць камунары машыну ў ліпені, а яе няма, ужо жнівень, а машыны няма, падсонечнік дазравае. Запрасілі Мэтпром тэлеграмай (аднэй і другой), а адказу няма. Калі ў Менск спэцыяльна паехаў прадстаўнік, дык яму адказалі, што машыну можна будзе адпусьціць толькі каля 10 верасьня.

Каб „разумныя“ мэтпромаўцы гэта адказалі своечасова, дык камуна накапацілася-б каб атрымаць машыну з Масквы, але аб гэтым яны не здагадаліся. Чаму-ж зрываецца гэткае важнае мерапрыемства, чаму застаецца гніць 2 гэктары падсонечніку, чаму знаходзіцца ў мёртвым капітале 3.000 руб. і чаму камуна цярпіць такую страту.

НК РСІ прымі пад увагу.

Г.

ВАША СПРАВА СЛУХАЦЬ ШТО ВАМ ЗАГАДВАЮЦЬ.

З такімі словамі пачынаў каморнік Блохін землеўпарадкаваньне калгасу „Савецкая Беларусь“. Можа быць другі раз прыдзецца і палаяцца ў часе працы, так ведайце, што я разьбірацца ня буду,—запоўняў Блохін калгасьнікаў на першым сходзе, і калгасьнікі толькі галовамі ківалі каморніку, паказваючы яму, што яны будуць працаваць так, што лаяцца ня прыдзецца.

На першым сходзе было дагаворана, што каморнік будзе ўвечары паведамляць колькасьць рабочых на другі дзень, але гэта засталося толькі на паперы, бо кожны дзень калгасьнікі чакалі да 10 гадзіны раніцы пакуль устане Блохін і скажа колькі трэба людзей. Лаянка, аб якой гаварылі, што яна „можа будзе“—была, „так точна“ і было яе так многа, што было аж тошна. Але калгаснікі не спрачаліся, слухалі каморніка і працу выконвалі.

Усё шло як быццам добра, але канец трохі вышаў ня такі, як трэба. Ворагу калгасу—Маскалевічу Грышку Блохін нарэзаў адразу тры сядзібы, а бедняка Зіновіча аставіў, як на выспе.

— За вошта-ж то так зроблена?—дзівяцца Гарочацкія дзядзькі,—ці не за тое часамі, што Грышка з жонкаю так многа працавалі супроць калектывізацыі? дадаюць тыя-ж сяляне.

Блохін зрабіў абрэзку сенажацяў у заможных і перадаў для касьбы ужо ў гэтым годзе калгасу, але калі паехаў да яго за 15 вёрст заможнік Макар Башак, то прывёз такую паперку.

„Старшине Зеляноцкага с-савету т. Рубанику. Вам надлежит проследить, чтобы луг в уроч. „Попово“ предоставленный в позке земл. устр. Башку Макару на один скос, был использован Башаком Макаром, потому, что он зачислен за ним на скос в этом 1929 г. Представить школе этот луг в этом году нельзя. Землеустроитель Блохин“.

Цікава, чаму гэтая адносіна ці службовая запіска так расходзіцца з ранейшымі словамі таго-ж Блохіна. Блохін раней адказваў Башаку, калі той прасіў у яго сенажаць, так:

— На тваёй сенажаці я быў, у цябе там папрэ з горла і напрасна не гавары, бо не атрымаеш.

Падругое,—зрабіў абрэзку і запісаў у праэкт, а потым прыватнай запіскай прапануе даць сенажаць у іншым месцы. Патрэцяе,—Блохін піша ў запісцы, што „ў парадку землеўпарадкаваньня“, а ў часе разгляду праэкту ня было і слова сказана аб гэтым факце.

Ці ня думае Блохін праводзіць „Лабаноўшчыну“ ня ў парадку землеўпарадкаваньня“, а ў парадку па-за землеўпарадкаваньнем?

В Дубовы.

Радасьць перамогі.

(Камуна „Чырвоны Сьцяг“).

Зьмейкай серабрыцца празрыстая Уса; шумуе, хвалюецца вадзяны вал ля каменнага млыну. Рокатам гульлівым гімны працы складае.

Зялёныя раскідзістыя прысады і сярод зеляніны прасторны крыху зьліняны дом з балконам, наўкола раскідана яшчэ некалькі будынкаў, у адным з іх—яслі.

Сьветлыя прытульныя пакоі, чыста прыбраныя пасьцелькі, а насупроць на сьвежым паветры малыя камунёнкі, з апэтытам уплятаюць макароны. Камунары на рабоце. Малая дзетвара таксама не адстае ад дарослых: вось на сярэдзіне двара дзе прывабныя зьляценьні бэзу, клёнаў і ліп ствараюць жывую альтанку,—яны старанна рашчышчаюць пляцоўку:

— Юзік, ды ты ня гэтак,—вось як трэба,—вучыць чарнявая дзяўчынка свайго суседа.

У пакоях, дзе калісьці пан самазадаволена цешыўся прыбыткам здабытым ад эксплёатацыі парабкаў і сялян сёньня дружная сям'я камунараў стварае сапраўдную ячэйку нашай будучыні:

— Ад кожнага па здольнасьцях, кожнаму пасільная работа.

Вось які там распарадак на сёньняшні дзень. Ля ганку рукамойнік, далей кухня і побач сталовая сьветлая, прасторная. На сталах, пакрытых белай цыратай, кожнаму асобны прыбор — талерка, лыжка, відэлак. Сытны здаровы абед.

І мімаволі ўспомнілася суседняя вёска, дзе ў аднэй бядняцкай хаце ля бруднага пакошанага стала, сядзела сям'я з дзесяці чалавек: яны таксама палуднавалі, спрытна чарпалі лыжкамі мутную зацірку з вялізарнай місы.

Адно дзіцянё сквапна зазірнула ў місу і працягнуўшы закарузлую ручонку выцягнула адтуль костку. Змораная маці са злосьцю стукнула яго лыжкаю па ільняной галавёнцы. Горкія сьлёзы...

А побач у Камуне—прытульная сталовая, дзе палуднуюць і адпачываюць маткі, сад і яслі з сытнымі дагледжанымі дзецьмі.

КРЫХУ ГІСТОРЫІ.

Камуна «Чырвоны Сьцяг» арганізавалася ў 1921 г., вось што апавядае аб яе ўтварэньні Зоська Верамейчык —70-цігадовая дэлегатка камуны:

— Уехалі мы бежанцамі з Гродзенскай губэрні. вядома з дзецьмі малымі цяжка было; невялічкую маёмасьць мелі, ды і тое ўсё па дарозе прадаць ды зьмяняць на хлеб прышлося.

Даехалі так аж да Калускае губэрніі, але ці-ж пражыць селяніну без зямлі?

Перш вайною так-сяк перабіваліся, батрачыць па багацеях прыходзілася; а пасьля рэвалюцыі кажа сын: на якое ліха пакутаваць гэтак, едзьма зямлю шукаць!

От, і паехаў пад гэтыя краі. Пасьля прапісвае, што там і рака і лес ёсьціка, што яшчэ людзі знайшліся з нашай стараны і ў панскім маёнтку камуніо мяркуюць арганізаваць.

Ня было нам як доўга раздумывацца, усё роўна без зямлі прападаць прыходзілася.

Так і прыехалі...

Маёнтак нам далі. Далучыліся мы да амэрыканцаў, тых, што пры цары з Гродзенскай губэрніі ў Амэрыку паважджалі, а цяпераха ізноў у свой край зьвярнуліся.

Пуста ў маёнтку было: печы разбураны, вокны павыбіты, засталося там некалькі панскіх батракоў, дык тыя хлеба сьпячы не дадуць, да сваёй халупкі блізка не падпусьцяць.

Вось так і туляліся мы, пад страхою кісялі з ягадаў варылі.

Пасьля разжывацца пачалі. З кожным годам лепшыла гаспадарка, а зараз самі бачыце: жыта як гай парасло, ярына таксама не адстае, агародніна сэрца цешыць.

Зараз камуна мае 240 дзесяцін зямлі, трактар і інш. сельска-гаспадарчыя машыны.

Жывуць і працуюць камунары дружна. Работаюць не абмежаваны лік гадзін —колькі прыдзецца, але кожны робіць тое, што яму больш падыходзіць: адзін працуе на полі, другі на скотным двары, сьвінарніку, ёсьць 2 кухаркі і штодня на кухні дзяжурыць хто небудзь з камунараў.

Маюць камунары чарговы водпуск; на два тыдні, цяжарнай кабеце даецца трох месячны водпуск.

Дзьве маткі з малымі дзецьмі зараз знаходзяцца пры яслях, дапамагаюць загадчыцы даглядаць дзяцей.

Даўней вопратка ў камуне давалася па патрэбнасьцях, але гэта выклікала частыя спрэчкі:

— Ён раней дзярэ, а я шаную пашу і г. д.

Цяпер кожны член камуны атрымоўвае на адзеньне сем р... ...месяц.

Камуна выклікала на …цтва суседні савгас «Нявелічы» і дзьве блізкейшыя камуны Самахвалавіцкага і Узьдзенскага раёну.

Настрой у камунараў бадзёры. У спаборніцтва ўступаюць з захапленьнем. За абедам жарты:

— Крэпісь, хлопцы, спаборніцтва пачынаем!

— Ды чаго там, нас работа не спалохае, памераемся сіламі!

ЗОСЬКА ВЕР…

Бяззубая сівенькая бабулька, клапатліва мітусіцца ля куратніку. Прыгаршчамі раскідае буйнае зерня:

— Цып, цып, цып!!!

З усіх бакоў зьбягаюцца пярнатыя насельнікі; квактухі з вывадкамі, рослыя выяўнічыя кураняткі, якія вышлі з пад маткінай апекі.

Адна з камунар… наказваючы на бабульку, гавора:

— Актывістка, дэлегатка наша—Зося Верамейчык.

У час полудня знаёмімся.

У маленькім пакойчыку Верамейчык ніводнай пылінкі, прытульна і ціха.

— Над ложкам у кутку Ленін вісіць.

З гутаркі выяўляецца, што бабка сапраўдная бязбожніца:

— Верылі мы ў бога, папоў кармілі, а дзеці свае—босыя ды голыя былі.

Няма цяперака дурных паноў ды падпанкаў на сваім карку трымаць. Хочаш есьці—работай.

А даўней поп пэндзелем пакрапіў, кадзілам пакурыў, а яму за гэта сала ды вяндліну давай.

Бабка яшчэ доўга гавора пра мінулую крыўду, нядолю.

Сівыя валасы выбіліся з пад хусткі, на зморшчаных шчоках заірдзелася чырвань.

Там, на яе радзіме, дзе ў рокаце хваль сіня-ружовага Нёмну, дзе між вярхлін белых крэйдавых гор захаваліся праклёны, захаваліся пагрозы зьверскаму панскаму ладу.

Дзе дасюль посьвіст польска-панскага бізуна глушыць прагу к сьвятлу і навукі.

Дзе штодня новыя ахвяры дзікага шалу магнатаў.

Дзе ў турмах, у няволі гніюць дзесяткі сотен лепшых змагароў за долю працоўных.

Там у пахілай зямлянцы жыве яе брат.

— Дзеці ня вучацца, бо пасвойму не дазваляюць, а папольску не разумеюць.

Хлеб не хапае і да каляд, а побач у маёнтку штодня паны піруюць, адтуль крыкі п'яныя, сьмех разгульны вецер даносіць.

Цяжка ўздыхае бабулька сьлязу дакучлівую рукавом выціраючы:

— Вось каб ім зд'эцца сюды папасьці. Пэўне-ж думалі, што ў рай трапілі. Я вось дарма што старая, а люблю новае ўсё—сходы, ды сьвяты пашыя. Жыву ў камуне бы ў сям'е сваёй.

Гэтаю вясною чырвонаармеец да нас прышоў, бледны сухі такі. Крыху папрацаваў, а пасьля занядужыў. Як сына роднага яго даглядала, ды ад сухотаў ня выратавалі—памёр. А сухоты тыя ў яго з турмы польскай, працаваў ён у Польшчы, а тыя зьверы яго ў турму засадзілі, адсядзеўшы там тры гады—уцёк, але хвароба ліхая скруціла небогу, не дала спакойна пажыць.

Моцны парыў ветру ў вакно ўварваўся, кветкі на століку перакуліў, бабка падымаць іх кінулася, а праз хвіліну сэкратар партячэйкі ўвайшоў:

— На сход жаночы хадзем!

НА СХОДЗЕ КАМУНАРАК.

На гранітных плітах балкону адна за аднэй зьбіраліся жанчыны—мускулістыя, загарэлыя...

Пераліўнымі званочкамі зьвінелі галасы...

У бліскучых вачох сьвяцілася радасьць перамогі.

Камунаркі ня ведаюць цяжару вясковых кабет: дзеці ў іх сытыя дагледжаныя, пасьля работы ня трэба аб полудні турбавацца ля печы тупацца, прыдзеш у сталовую, сядзеш спакойна за стол, а чарговыя дзяжурныя есьці пададуць.

Але і ў жыцьці Камуны ёсьць свае цені. У жвавай гутарцы апавядаюць камунаркі аб зусім недапушчальных фактах: калі жанчыны адыходзяць ад грамадзкай работы, калі ніводнай жанчыны няма ў партячэйцы, калі ніводная ня ўдзельнічае ў рабоце савету камуны.

Паўстае пытаньне—хто вінен у гэтым, дзе шукаць прычыны гэтай нядбайнасьці, калі ва ўмовах найбольш спрыяючых разьвязаньняў жаночага пытаньня жанчыны ізноў адціснуты ў бок ад грамадзкага жыцьця.

Вось аб гэтым адна за аднэй выступаюць, гавораць камунаркі:

— У нас сходы склікаюць у той час, калі жанчыны на рабоце заняты: тая кароў доіць, тая на кухні ўпраўляецца, а маткам дзяцей трэба спаць пакласьці... Вось і ня ідзеш на сход, —жаліцца кандыдат у савет камуны стройная гаворкая дэлегатка.

Тут-жа ў гутарцы выяўляецца, што ў камуне ёсьць **адзінаццаць** камсамолак, але яны мала чым розьняцца ад агульнай масы і вогульле таксама адарваны ад грамадзкай работы:—была спроба, каб скарыстаць іх для ліквідацыі няпісьменнасьці, але з гэтага малы толк вышаў. Тая не захацела, тая пачала ды кінула, а некаторых нават на сход калачом не заманеш.

Вывады самі па сабе просяцца: адзінаццаць камсамолак, здаровых, энэргічных, замест таго, каб шырока разгарнуць працу ў ваколічных вёсках, а тым больш актыўна ўдзельнічаць у ва ўсім грамадзкім жыцьці камуны, бяз бою здаюць пазыцыі. Наперакор традыцыям камсамолу шчыльна заплюшчваюць вочы на вялізарнейшыя задачы ўдзелу жанчын у нашым сацыялістычным будаўніцтве.

Загадчыца ясьляў—камсамолка (была на курсах), а на запытаньне: Ці праводзяцца гутаркі з маткамі аб выхаваньні дзяцей і на параду, што варта пры гэтым часопісь «Работніцу і Сялянку» выкарыстоўваць, адказвае:

— Ды нашыя маткі самі аб гэтым ведаюць, нам гэта непатрэбна.

Такім чынам, яна зусім занядбала, забылася аб культурна-выхаваўчай рабоце ясьляў, ня толькі з малымі выхаванцамі, але і з маткамі аб'яднанымі навокал іх, і гэта ў абавязковым парадку.

Трэба тут-жа зазначыць, што ў яслях з дзецьмі не праводзіцца арганізаваная работа і яны ў рассыпную бегаюць па задворках, па саду і г. д.

Гэта гавора ізноў-жа аб няўменьні, а можа і не жаданьні паставіць работу, як належа быць; тым больш, што дзеці за выключэньнем двох сысуноў, пры каторых знаходзяцца маткі, пераважна дашкольнага ўзросту.

Багата скаргаў было і на цяперашніх жэноргаў (ён на сходзе не прысутнічаў). Камунаркі шчыра жаліліся; малую ён з намі работу вядзе:

— Прыдзеш на сход дэлегацкі, возьме праграму зноў старыя даўно вядомыя пытаньні пачне разьбіраць, абрыдзела старое слухаць. Нам-бы з дактарам, ці з старшынёй сельсавету гутар-

ЧЫСТКА АЗДАРОВІЦЬ НАШ АПАРАТ.

НЕДАСТАТКОВА ПРАВЯЛІ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ ПРАЦУ.—МЯСЦКОМЫ СЛАБА ДАПАМАГАЛІ Ў ЧЫСТЦЫ.—ВЫТВОРЧЫЯ ПРАФСАЮЗЫ МАЛА ПАПУЛЯРЫЗАВАЛІ СЯРОД РАБОЧЫХ ПЫТАНЬНІ ЧЫСТКІ САВЕЦКАГА АПАРАТУ.

Недахопы ў чыстцы апарату.

Цэнтральнае Праўленьне Саюзу Савгандальслужачых падвяло папярэднія вынікі працы па чыстцы савецкага апарату.

Уражаньне ад чыстцы апарату на агульных сходах сьведчыць аб тым, што самі супрацоўнікі ўстановы ў якой праводзілася чыстка, зусім неахвотна прымалі ўдзел у выяўленьні недахопаў у працы ўстановы, зусім слаба дапамагалі выяўляць бюракратызм і цяганіну, нібы ў нашых установах бюракратызм і цяганіна рэдкія госьці. У час чысткі на сходах назіралася некаторая замкнутасьць і „кругавая парука“,—гэта добры працаўнік, гэта наш хлапец і г. д.

Толькі крытыка асобных таварышоў не сяброў калектыву, разьвязвала языкі служачым і яны пачыналі апраўдвацца, а не прызнаваць сваіх памылак. Назіраліся і такія выпадкі, калі ў калектыву ўстановы, якая праходзіла чыстку, зьяўлялася жаданьне „отыграться“ па якім небудзь адным служачым і, як правіла, пераважна з служачых з тэхнічных працаўнікоў.

Якія-ж мы маем вынікі ў працы па чыстцы апарату?

Члены саюзу недастаткова ўясьнілі значэньне чысткі савецкага апарату, як мерапрыёмства па палепшаньню работы ўстановы і забесьпячэньня выкананьня 5-гадовага пляну „разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры. Вінаваты тут і мясцкомы, якія далёка недастаткова правялі растлумачальную працу сярод сваіх калектываў аб значэньні чысткі. Больш таго, самі мясцкомы часам недастаткова дапамагалі камісіям па чыстцы апарату ў выяўленьні ўсіх недахопаў, бюракратызму і валакіты ў установах.

Нельга не адзначыць і таго факту, што вытворчыя прафсаюзы, відаць, мала папулярызавалі сярод рабочых пытаньне чысткі савецкага апарату, а таму мы былі сьведкамі недастатковага ўдзелу рабочых у чыстцы. Да недахопаў трэба аднесьці і тое, што тлумачальная праца аб чыстцы савапарату была пастаўлена слабавата, дзякуючы чаму маюць месца выпадкі, калі члены прафсаюзаў мала ўсьвядомілі сабе значэньне чысткі.

З прычыны вялікага разрыву паміж падрыхтоўчай працай да чысткі і самой чысткай, назіраліся выпадкі аслабленьня работы ўстановы. Гэтае назіралася пераважна з боку тых працаўнікоў, якія адчувалі за сабой грашкі.

Да чысткі савецкага апарату арабочваньне апошняга амаль не праводзілася. Зараз становішча ў гэтым напрамку паступова палепшаецца: у некаторых установах ужо працуюць вылучэнцы-рабочыя (Дзяржбанк, Дзяржстрах). Праўда, вучоту працуючых у савецкім апараце вылучэнцаў у саюзе няма. Праводзіцца праца па прасоўваньню служачых, галоўным чынам, моладзі на больш адказныя пасады. Гэту працу праводзяць мясцкомы з ліку тых служачых, кандыдатуры якіх напярэдадні чысткі апарату абгаварваліся на агульных сходах працаўнікоў. Так, у Дзяржбанку аслабаніўшыяся пасьля чысткі вышэйшыя пасады былі ў парадку паступовага прасоўваньня замешчаны ніжэйшымі служачымі.

Падрыхтоўка замены вычышчаным з беспрацоўных праводзіцца праз курсы; пры Менскім Цэрабкопе былі арганізаваны курсы на 150 чалавек па падрыхтоўцы прыказчыкаў з беспрацоўных, курсы закончылі вучобу і частка курсантаў ужо працуе ў магазынах Менскага ЦРК. Працуюць у Менску курсы па падрыхтоўцы працаўнікоў загатавіцельнага апарату. Гэтыя курсанты будуць скарыстаны Саюзхлебам і хлебнай інспэкцыяй.

ЦП саюзу супольна з ІК РСІ утварылі курсы па падрыхтоўцы сэкратароў-кіраўнікоў спраў, на гэтых курсах займаецца 15 беспрацоўных членаў саюзу.

Зараз Цэнтральнае Праўленьне Саюзу савгандальслужачых праводзіць праверку практычнай дапамогі мясцкомаў камісіям па чыстцы савецкага апарату. Праводзіцца таксама абсьледваньне Магілеўскага акруговага аддзяленьня саюзу з мэтай выявіць наколькі саюз прымае ўдзел у чыстцы савецкага апарату.

Апарат ачысьцілі.

Праведзеная чыстка савецка-каапэрацыйнага апарату па Парыцкаму раёну (Бабруйскай акругі), выявіла на шэрагу з добрай працай і шмат адмоўных зьявішч: праяўленьне правага ўхілу на практыцы—у працы раённых устаноў і паасобных працаўнікоў, факты скрыўленьня клясавай лініі, чужыя элемэнты ў апараце, бюракратызм і г. д.

У Парыцкім РВК установлен момант парушэньня клясавай лініі ў час разгляду адміністрацыйных спраў на кулака за парубку леса накладаўся такі самы штраф, як і на бедняка.

Шацілаўскае с.-г. крэд. т-ва выдала крэдыт 200 руб. на каня пазбаўленаму ў выбарчых правох, уласьніку маслабойкі і, нават, у час выдачы, у яго меўся конь.

У Шчадрынскім с.-г. крэд. т-ве выявілася яшчэ больш яскравае скрыўленьне клясавай лініі. Былому абшарніку Бэрковічу, які меў раней 300 дзесяцін зямлі, браты яго служылі ў белапольскай арміі, рабілі рабункі і налёт на мястэчкі, які абкладзен індывідуальным падаткам, пазбаўлен права выбарчага голасу выдан 600 руб. доўгатэрміновы крэдыт на 10 год на пабудову агнятрывалага будынку. Атрыманыя 600 руб. Бэрковіч і ня думаў скарыстоўваць па прызначэньню, а скарыстаў іх на закупку па лімітным цэнам цэмэнту, які перапрадаваў. У гэтым самым т-ва дадзен доўгатэрміновы крэдыт кулаку Шчыгельскаму на малатарню, у той час, як гэты крэдыт павінен давацца калектывам, машынным т-вам і іншым аб'яднаным групам сялян. Увесь гэты крэдыт выдадзен без абгаварэньня праўленьня т-ва. Адначасова адказваецца крэдыт бедняку Круку на закупку цэглы ў час вясеньняй пасяўной кампаніі ў суме 40 руб. Нават адзін з сяброў праўленьня заявіў: „Яму цэгла не патрэбна, бо ён свой гной і на плячох вынясе“. Толькі ўмяшацельства ў гэту справу РК КП(б)Б і РВК дала магчымасьць атрымаць крэдыт бедняку Круку. Гандлёвы апарат т-ва складзен з былых гандляроў, пазбаўленых права выбарчага голасу.

У Парыцкім с. г. крэд. т-ве выяўлен букет родзічаў сярод працаўнікоў т-ва. У працы т-ва існуе поўная сямейсьцьвеннасьць, старшыня т-ва член партыі Шамакоў ня толькі не рэагаваў, але сам абараняў сямейсьцьвеннасьць.

У Слаўніцкім л-ве выяўлена, што лясьнічы і памоцнік зьвязаны з чужым элемэнтам, ксяндзом і г. д. Нагляданіся грубыя адносіны да сялянства.

Крукаўскае л-ва мае значны склад старых лясьнікоў, якія служылі пры абшарніках, ня маюць падыходу да сялянства, ня могуць успрыняць палітыку партыі і ніякага ўдзелу ў грамадзкай працы вёскі ня прымаюць. Маюцца факты п'янства і склокаў сярод працаўнікоў.

У Парыцкім л-ве выяўлена „найлепшае дасягненьне“ бюракратызму, лясьнічы Бурак і памоцнік Шарупіч працуюць за адным сталом і вядуць паміж сабой афіцыйную перапіску па розным галінам працы.

Ва ўсіх гэтых установах за выключэньнем Слаўніцкага і Парыцкага л-ва кіраўнікамі зьяўляюцца партыйцы, і ведаючы аб гэтых хваробных зьявішчах, ня прымалі мер да зьнішчэньня, і толькі чыстка савапарату іх зварушыла. Усяго праверана па раёну 40 савецка-каапэрацыйных устаноў з агульнай колькасьцю 310 чал. У выніку чысткі зьнята (па I катэгорыі) 27 чал., (па II катэгорыі) 12 чал. і (па III катэгорыі) 14 чал. Атрымалі розныя спагнаньні ўсяго 61 чалавек, альбо 19 процантаў да агульнай лічбы ўсіх правяраемых. Чыстка аздаравіла апарат, што забясьпечывае яго працаздольнасьць. Падрыхтоўчая праца да чысткі была праведзена дастатковая, праводзіліся сходы беднаты, батрацтва, членаў прафсаюза, селькораў і насельніцтва з абгаварэньнем пытаньня аб чыстцы. Недастаткова праведзена праца сярод жанчын. Арганізаваныя рабоча-сялянскія брыгады праверваючы працу ўстаноў, рабілі праверку без удзелу мас. У многіх месцох праверка вылілася ў вузка-фармальную рэвізію. Райкамісія садзейнічаньня растлумачальную працу правяла добра, але зусім не кіравала працай брыгад. Кампраметуючы матар'ял рассылаўся на расьсьледваньне па ўстановах. Меліся моманты, калі кіраўнікі ўстаноў самі разглядалі матар'ял паступаючы на іх. На працягу ўсёй чысткі выдаваліся насьценныя газэты.

Партарганізацыя дастатковая займалася пытаньнем чысткі і да гэтай працы была падрыхтавана. Удзел камсамольскіх ячэек быў слабы і яны не адчуваліся ў гэтай працы. Бедната актыўна ўдзельнічала ў тых мясцох, дзе праводзілася сярод іх праца, і наогул, працоўнае насельніцтва актыўна ўдзельнічала. Клясавы вораг: кулакі сэктанты, і лўна антысавецкі элемэнт, рабілі спробы дыскрэдытаваць асобных актыўных працаўнікоў, але бедната давала адпор.

РК КП(б)Б падвёў вынікі чысткі па раёну і прыняў шэраг практычных мерапрыёмстваў па забясьпячэньню апарату новымі працаўнікамі замест вычышчаных.

Апарат раёну ачышчан, але праца па падрытоўцы новых працаўнікоў пастаўлена дрэнна. Неабходна яе палепшыць, высоўваючы новыя кадры вылучэнцаў з рабочых батракоў і беднаты.

Апякін.

Падмацаваліся лепшымі сіламі.

(Сеньненскі р., Віцебшчына).

Чыстка савецкага апарату па раёну ўжо скончана. У выніку вычышчана некалькі варожых нам элемэнтаў. Сярод іх ёсьць адзін былы прыстаў, які служыў рахункаводам у друкарні; адзін былы паліцэйскі чыноўнік, які быў адказным сэкратаром Суда, а раней пры царызьме прымаў актыўны ўдзел у падаўленьні рэвалюцыйнага руху ў Сяньне ў 1905-1906 г.; вычысьцілі былага і калчакоўца. Гэта самыя галоўныя героі чысткі. Некаторых пакінулі на пасадах, некаторым ускладалі належнае спагнаньне. Тут цікава адзначыць прадзелку Загадчыка Нардому, які пасьля таго, як яго вычысьцілі выбраў былую жандармэрыю і „подобных своих приятелей“, з якімі намаўляўся аб тым, каб яны дапамагалі яго справе“.

Зьнялі з працы і некаторых старшынь і сэкратароў сельсаветаў, галоўным чынам за скрыўленьне клясавай лініі, п'янства і інш.

Старшыня Беліцкага КСУ па справах кулакоў езьдзіў з хадайнічаньнем у Маскву і Менск; муку даваў больш заможным, чым беднякам.

Чыстка савецкага апарату ў раёне праходзіла пры актыўным удзеле з боку ўсяго працоўнага сялянства. Чыстка апарату ўзьняла аўтарытэт раённых устаноў, зрабіла больш гібкім савецкі апарат, зрабіла савецкі апарат больш чулым, да запросаў працоўнага сялянства. На сходах сяляне прымалі самы актыўны ўдзел, выказваліся ў спрэчках, унасілі свае дзелавыя прапановы.

Замест вычышчаных, савецкі апарат папоўніўся лепшымі сіламі з рабочых і працоўнага сялянства.

З-кі.

Рабселькоры дапамагаюць у чыстцы.

(Полаччына).

У сучасны момант у нашай акрузе пасьпяхова праводзіцца чыстка партыйных шэрагаў, а таксама савецкага апарату ад шкоднікаў будаўніцтва, разлажыўшыхся элемэнтаў, ад былых людзей.

Усім вядома, які ўдзел могуць прыняць у гэтых важных кампаніях рабселькоры. Шляхам высьвятленьня чысткі на старонках насьценгазэт, а таксама друкаваных газэт, яны могуць выявіць некаторых шкоднікаў. Гэтая справа на Полаччыне за апошнія часы крушылася наперад.

Рабселькоры гораду, Дрысенскага, Ветрынскага, Лепельскага і інш. раёнаў у часе чысткі выпусьцілі спэцыяльныя нумары насьценгазэт, прысьвечаныя спэцыяльна чыстцы партыі і апарату.

Апрача гэтага, рабселькоры высьвятляюць ход чысткі ў акруговай газэце „Чырвоная Полаччына“ і інш. газэт. Напрыклад, селькор Лысы з Лепельшчыны выявіў праз акруговую газэту дзесяткі варожых элемэнтаў, частка якіх ужо вычышчана з савецкага апарату.

Сьпір. Міх.

Чыстка вясковых ячэек праходзіць актыўна.

На акрузе з посьпехам праходзіць чыстка вясковых партыйных ячэек. Адчуваецца вялікая актыўнасьць з боку батракоў, беднякоў, жанчын, а таксама сераднякоў. Гэта кажа аб тым, што працоўныя колы сялянства вельмі зацікаўлены чысткай партыі, якая дапаможа пазбавіцца ад варожых элемэнтаў.

16 ліпеня ў Дрысе адбыўся сход па чыстцы, на якім прысутнічала каля 100 асоб, з гэтага ліку 30 проц. жанчын-сялянак. Перад пачаткам чысткі старшыня камісіі зрабіў невялічкую прамову, у якой адзначыў, што чыстка партыі мае мэтай ня толькі пазбавіцца ад варожых элемэнтаў, але яшчэ больш узмацніць партыйную работу сярод акаляючага насельніцтва.

Пачалася чыстка-праверка кожнага таварыша. Тут выяўляецца шэраг дасягненьняў у працы мястэчковай партыйнай ячэйкі, але побач з гэтым нагляданіся некаторыя недахопы, якія перашкаджалі ў штодзённай працы. Напрыклад, былі моманты п'янкі і інш., што не павінна мець месца сярод партыйцаў.

Сход працягнуўся да цёмнай ночы. Урэшце—з 16 праверанных таварышоў 1 атрымаў вымову, 4 таварышам пастаўлена на від і аб адным астаўлена пытаньне адчыненым. Сход сустрэў такую пастанову добра. Сяляне зазначалі, што пры чыстцы адчувалася здаровая, правільная крытыка і вялікая актыўнасьць.

24 ліпеня адбыўся сход Юзафаўскай партыйнай яч., Валынецкага раёну, на якім стаяла і займала належнае месца пытаньне адносна чысткі. Тут высьвятлілася, што ячэйкай вялася вялікая праца сярод акаляючага сялянства, сярод беднаты, але побач з гэтым нагляданіся некаторыя хібы ў працы паасобных таварышоў.

Напрыклад, Пятроўскі Язэп слаба ўдзельнічаў у працы, нагляданіся моманты п'янкі, скрыўляў правільную лінію. Налпан Міхась трымаў шчыльную сувязь з млынаром, піў разам з ім, рабіў ложныя акты, за што камісіяй выключан з шэрагу партыі.

Да тых таварышоў, якія дрэнна працавалі, альбо скрыўлялі клясавую лінію, прыняты належныя крокі ў бок зьнішчэньня ўсіх хваробных зьявішч, а таксама недахопаў.

Пасьля сходу сяляне казалі аб тым, што дзякуючы правядзеньню чысткі, партыя пазбавіцца ад варожых элемэнтаў, яшчэ больш узмацніць сваю працу сярод бядняцка-серадняцкай часткі і будзе з яшчэ большым посьпехам кіраваць сацыялістычным будаўніцтвам у нашай вольнай краіне.

Цікава адзначыць, што у час чысткі, некаторыя батракі, беднякі, а таксама лепшыя серадняки падаюць заявы аб уступленьні ў шэрагі партыі. Яны гавораць, што мы заменім дрэнных вычышчаных былых партыйцаў.

Сьпір. Міх.

Аб выніках чысткі магілеўскага сельбанку

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта).

Гэтымі днямі скончылася чыстка апарату магілеўскага аддзяленьня сельбанку. Камісіяй праверана 20 асоб, складаючых гэты апарат—параўнаўча невялікі па штату, але значны па недахопах паасобных супрацоўнікаў.

Зусім зразумела, што менавіта супрацоўнікі сельбанку, установы, шчыльна зьвязанай з насельніцтвам, галоўным чынам з сялянствам, павінны былі-б дакладна праводзіць вытрыманую клясавую лінію ў сваёй рабоце.

Нажаль, гэтага ў рабоце магілеўскага аддзяленьня сельбанку якраз не прыкмячалася.

У аддзяленьні сельбанку сядзелі дагэтуль «працаўнікі», сьвядома падрываўшыя мерапрыёмствы камуністычнай партыі і савецкай улады поўным ігнараваньнем іх.

У выніку дасьпалай праверкі, па асобных работнікаў накладзены тыя, альбо іншыя спагнаньні.

Гр-н **Бяльковіч М. А.**, будучы інструктарам сельбанку, увесь час імкнуўся заціраць, звадзіць на нішто правільна-клясавую лінію. Ён надзвычайна фармальна адносіўся да выконваньня сваіх абавязкаў. За гэта камісія на чыстцы, вынесшы яму суровую вымову, зьняла яго з працы, забараніўшы на працягу трох год займаць адказныя пасады.

Скрыўляў клясавую лінію ў рабоце і бухгальтар **Інчык А. С.** Выяўлена, што ён вельмі бюракратычна адносіўся да наведвальнікаў. За гэта ён атрымаў ад камісіі належную „падзяку“—суровую вымову з папярэджаньнем.

Галоўны бухгальтар **Зяблаў І. Х.** хоць і адносіўся больш-менш лагодна да наведвальнікаў, але сваю «фанабэрыстасьць» выліваў на падпарадкаваных супрацоўнікаў. Зяблаву дадзены шэраг паказаньняў дзеля зжыцьця такога зьявішча.

Кульгала працдысцыпліна ў інструктара **Суздалёва В. Х.** Ён дазваляў сабе самавольныя адлучкі на 5-7 дзён. Гэта Суздалёву пастаўлена на від.

Апроч таго, пастаўлена на від машыністцы Дарашкевіч за няўжываньне беларускае мовы і Ярыну за зьяўленьне на працу ў нецьвярозым выглядзе.

Трэба лічыць, што праверка дасьць новы імпэт сьвядомым працаўнікам аддзяленьня, якое, ачысьціўшыся ад чужога элемэнту, шчыра возьмецца за работу.

Леванід Свой.

праводзіць—вось гэта зацікавіла-бы іх.

Некаторыя лічуць, што ён ня мае дыходу да работы сярод жанчын:

— Ат, што ён разумее, нам-бы вось 6 баба была зусім па іпакшаму ё-бы ішло.

Выявілася, што суседні Леданскі сельсавет (вёска Леднік) ня выклікае прымацаваных дэлегатак на сходы і паседжаньні.

Дэлегатка з грудным дзіцёнкам весела і бадзёра гавора:

— Мы хочам на практыцы вучыцца, каб быць сапраўды актыўнымі практычнымі работнікамі.

Навокал на сонечнай палянцы, сярод рознакаляровых пахучых кветак і зеляніны новая зьмена—звонкагалосая маленькая дзетвара гуляе ў схованкі.

Тут-жа ля ганку старшыня камуны трымае маленькую дачку, тым часам маці яго прымае актыўны ўдзел у гутарцы. Правільнае разьмеркаваньне працы і яно нікога ня дзівіць, ніхто з камунаў не гавора, што гэта не мужчынская работа. Але ці часта надараюцца гэткія факты нават у жыцьці камуны.

Гадзіны тры цягнецца сход камунаркі, рэдактар „Работніцы і Сялянкі“ Меерзон і інструктар жанаддзелу Акругкому т. Мірская падрабязна спыняюцца на задачах сацыялістычнага спаборніцтва і ў удзеле ў ім жанчын дэлегатак, як першых ініцыятараў і застрэльшчыкаў. Гаворачы аб чыстцы партыі зазначаюць:

— Жанчыны камунаркі павінны ўнесьці лепшую сваю частку партыі, каб на месца вычышчанага непатрэбнага разлажыўшагася баласту у партыю ўліліся здаровыя пралетарска-бядняцкія кадры сапраўдных будаўнікоў сацыялізму.

Камунаркі уносяць прапановы:

— Трэба ў гэтую нядзелю 7-га ліпеня на сходзе канкрэтна абгаварыць пытаньні сацыялістычнага спаборніцтва

— Трэба арганізаваць жаночы палітгурток і іншыя гурткі.

— Даручыць савету камуны даць канкрэтную нагрузку жаночым кандыдаткам яго.

— Даручыць савету камуны і сакратару партячэйкі сачыць за тым, каб сходы і розныя заняткі праводзіліся ў той час, калі жанчыны асвабадзіліся ад работы.

— Што тыдзень па нядзелях рабіць калектыўную чытку і абгаварэньне матар'ялаў па „Беларускай Работніцы і Сялянцы».

— Павесьці рашучую барацьбу са склокамі і абывацельскімі спрэчкамі ў камуне.

— Прапанаваць Леданскаму сельсавету уцягнуць у работу прымацаваных дэлегатак.

Прыветна разьвіталіся. Камунаркі гасьцінна запрашалі;—не забывайцеся на нас. На тыдзень, на два прыяжджайце.

Жыцьцём нашым пазнаёміцеся, працу наладзіць дапаможаце.

Вось мільганулі і засталіся далёка—кашлатыя прысады, белая брама, крыху зьліняўшы дом, дзе пад гасьціннаю страхою, чорнакрылыя ластаўкі зьвілі сабе прытульныя гнязьдзечкі, серабрыстыя зьмейкі Уса і бурклівы дзядуля млын.

Насустрач істужкай ільлецца дарога, ад ароджаная цёмнай сьцяною густога зарослага лесу.

У вачох паўстаюць абразкі жыцьця Камуны і тагды бясконца хочацца думаць марыць аб недалёкіх любых днях нашай будучыны.

І тады ўся істота суздром адчувае магутны творчы ўздым, цудоўны росквіт савецкай краіны.

З. Бандарына.

Койданаўскі раён.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Падпіска на 3 пазыку Індустрыялізацыі.

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта).

Па няпоўных даных на 14 жніўня агульная падпіска на 3 пазыку індустрыялізацыі па Магілеўшчыне дасягнула 438130 руб.

З раёнаў на першым месцы покуль-што стаіць Шклоўшчына, даўшая падпіскі на новую пазыку 38700 р.

Значна адстаюць Чэрыкаўскі і Чырвонапольскі раёны. Чырыкаўскі раён, напрыклад, даў падпіскі ўсяго на 1200 рублёў.

Па гораду Магілеву рабочыя і служачыя датэрмінова надпісаліся на 352830 р.

Відавочна, што наогул акруга ў падпісцы адстае.

Гэта яшчэ раз ставіць перад акруговымі арганізацыямі пытаньне аб неабходнасьці пасіленьня растлумачальнае працы.

Юр.

За сродкі ад самаабкладаньня.

(Быхаўскі раён, Магілеўскае акругі).

Некалькі часу таму назад у вёсцы Вялікая Тошчыца школа знаходзілася ў звычайнай сялянскай хаце—цеснай, цёмнай, з закопчанымі балькамі і павыбітымі шыбінамі.

Сёлета сялянства за кошт самаабкладаньня абсталёўвае новую школу. Закупілі ў лясьніцтве лесу, а за работу цесьлярам будзе плаціць райвыканком

Школа разьмеркавана плянава, вялікага памеру.

Больш ня будуць сьляпіць вочы бедныя вучні. Сяляне тошчыцкія надзвычайна задаволены гэтым. У „всеоружии“ спатыкаюць яны новы навучальны год.

Л-ны.

Посьпехі III-й пазыкі.

Гомель, 19-8. Падпіска на 3-ю пазыку з кожным днём павялічваецца. На 14 жніўня датэрміновая падпіска на пазыку дасягнула 1400 тыс. рублёў, што складае 70 проц. заданьня.

З паказанай сумы рэалізавана на 244570 руб. сярод чыгуначнікаў, на 7215 руб.—сярод сялян, на 42845—сярод членаў саюзу, якія працуюць на сяле і на 791930 рублёў—сярод рабочых і служачых Гомелю. Акрамя гэтага, яшчэ не аформлена падпіска на 33 тысяч рублёў.

Селянін Шылянкоў здаў датэрмінова падатак і падпісаўся на пазыку на 100 р.

Селянін-вылучэнец тав. Шылянкоў (Расьнянскі раён, Аршаншчына) у адказ на наглы выпад міжнароднай буржуазіі ўнёс датэрмінова поўнасьцю сельска-гаспадарчы падатак за 1929-30 год і падпісаўся на 3 пазыку індустрыялізацыі на 100 руб.

Пабудова 2-га крахмальнага заводу.

Гомель, 19-8. Белхарчтрэст намячае ў будучым гаспадарчым годзе пабудаваць 2-гі крахмальны завод у адным з раёнаў акругі. Па праэкту гэты завод павінен будзе перапрацаваць да 500 тысяч пудоў бульбы за 100 дзён. Адпаведныя органы прыступілі да вывучэньня паасобных раёнаў для выбару месца да пабудовы гэтага заводу.

Камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту.

Ворша, 19-8. Арганізавана акруговая камісія садзейнічаньня дзяржаўнаму крэдыту. Усім райвыканкомам, гарадзкім і сельскім саветам запрапанавана таксама арганізаваць такія-ж камісіі пры саветах.

Арганізацыя камісій садзейнічаньня дзяржкрэдыту павінна быць скончана у двухтыднёвы тэрмін.

Новыя буйныя савгасы.

Гомель, 19-8. Белсельтрэст арганізуе ў Увараўцкім раёне новы савгас на плошчы 975 гэкт. Гэты савгас будзе вырашчваць, галоўным чынам, лубін і сэрадэлю. Апроч таго, распачата падрыхтоўка па арганізацыі новага савгасу ў Насовіцкім раёне на абшары да 600 гэкт.

Буйны калгас.

Гомель, 17-8. Калгассаюз скончыў арганізацыю ў Арэвічах, Хойнікскага раёну буйнага калгасу на плошчы 2500 гэктараў. У бліжэйшыя дні ў калгасе пачнуць будаваць дом на 10 кватэр, хлеў на 100 галоў жывёлы і цагельна-чарапічны завод. Прыняты захады да закупкі трактара. Камсамольская раённая арганізацыя шляхам утварэньня суботнікаў аказвае дапамогу калгасьнікам ва ўборачнай кампаніі.

Спаборніцтва іх не датычыцца.

(Лагойскі РВК, Меншчына).

Яшчэ ў чэрвені месяцы па ініцыятыве саюзу супрацоўнікі РВК паднялі пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве. Склікалі агульны сход. Тры гадзіны гаварылі і пастанавілі: абраць камісію. Абралі. Камісія склікае нараду дзеля выпрацоўкі ўмовы. На нараду адказныя працаўнікі РВК ня ідуць. Тры разы склікалі нараду, тры разы зрывалася, бо адказныя працаўнікі ня прыходзілі.

Склікалі зноў сходку. Зноў гаварылі і пастанавілі: даручыць загадчыкам аддзелаў даць камісіі ўмовы і вызваць на спаборніцтва Астрашыцка - Гарадзецкі РВК. Праходзіць тры тыдні і зноў няма ўмоў, а праца па спаборніцтву ў выніку —не пачата.

Як відаць, некаторыя райвыканкомаўцы лічаць, што за сацыялістычнае спаборніцтва яны павінны толькі агітаваць, а не працаваць.

Я. К.

Першыя вынікі сацыялістычнага паходу.

Полацак, 19-8. Сацыялістычнае спаборніцтва па саюзу будаўнікоў і на ўсіх прадпрыемствах разгорнута шырока. Да гэтага часу ўсе займаліся гаварыльняй: засядалі, пісалі пляны, рэзалюцыі, праэкты, заключалі дагаворы, а справа стаяла нярушна.

Зараз становішча зьмянілася. Усяго спаборніцтвам ахоплена каля 3 тысяч будаўнікоў, заключана 38 практычных дагавораў. Цікавы першыя вынікі сацыялістычнага паходу.

Па асобных відах работы зьніжэньне браку дасягнула 50 проц., павялічэньне прадукцыйнасьці працы да 14 проц., зьніжэньне сабекошту да 15 пр.

На цагельні прамкантрэсту зьніжэньне браку дасягае 50 проц., палепшаньне якасьці апаленьня цэглы на 8 пр.

Працаўнікі акршляхаддзелу адмянілі ўсе рэлігійныя сьвяты, без замены іх выхаднымі днямі, перапынак зьменшылі да 10 хвіл.

С. Міхальцоў.

Падрыхтоўваем новыя грамадзкія работы.

Ворша, 19-8. Скончана падрыхтоўка да новых грамадзкіх работ у акрузе. Акрвыканком зацьвердзіў плян гэтых работ на 1929-30 год у суме 23000 руб., у якую ўваходзіць і тыя работы, якія будуць праводзіцца увосень і зімою новага гаспадарчага году.

Гарсавет і акруговая інспэкцыя працы ў сучасны момант вызначае аб'екты грамадзкіх работ.

Новы начны тубсанаторы.

ВОРША, 20-8. Акрвыканком парашыў пабудаваць у г. Дуброўна начны туберкулёзны санаторы. Праца на пабудове распачнецца ў гэтым годзе. На пабудову гэтага санаторыя па бюджэту масцца 15 тыс. р.

Уся пабудова абойдзецца звыш 60 тыс. р. Адносна апошняй сумы сродкаў, акруговаму інспэктарыяту аховы здароўя даручана паставіць пытаньне перад належнымі ворганамі аб даасыгнаваньні іх у будучым годзе.

Пабудову санаторыя будзе праводзіць Акржылсаюз.

Падрыхтоўка да прызыву слабая.

Гомель, 20-8. Водлуг вестак з месц, падрыхтоўчая праца да прызыву 1907 году яшчэ недастаткова разгорнута. Агульныя сходы прызыўнікоў праводзяцца не на ўсіх прадпрыемствах і ў селішчах акругі. Саюзныя арганізацыі таксама слаба ўдзельнічаюць. АПБ прапанаваў саюзам прыняць актыўны ўдзел у будучым прызыве і на чарговым пасяджэньні прэзыдыуму будуць распрацаваны практычныя мерапрыёмствы па абслугоўваньню прызыўнікоў.

Рыхтуемся да сьвята ўраджаю.

Ворша, 20-8. Пачалася падрыхтоўка акругі да сьвята ўраджаю. У гэтым годзе сьвята будзе праводзіцца пад лёзунгамі падвядзеньня вынікаў правядзеньня гадавой сельска-гаспадарчай кампаніі ў акрузе, з мэтай выяўленьня дасягненьняў і недахопаў у галіне пашырэньня і замацаваньня сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, пашырэньня пасеўнай плошчы, павышэньня ўраджайнасьці і мабілізацыі вакол іх думкі шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Таксама Дзень Ураджаю у гэтым годзе будзе першай генэральнай падрыхтоўкай да Усебеларускай выстаўкі з боку сялянства, устаноў, прадпрыемстваў і арганізацыі і выяўленьня рэальных магчымасьцяй акругі для прыняцьця ўдзелу ў выстаўцы.

У раёнах ужо складзены камісіі па падрыхтоўцы да сьвята ўраджаю, а акруговаму зямельнаму аддзелу прэзыдыум акрвыканкому даручыў мець сталы нагляд за падрыхтоўчай працай да сьвята. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай ускладзена на акруговы выставачны камітэт.

Дэлегацыя Аргентыны ў Гомелі.

Гомель, 20-8. У Гомель прыехалі прадстаўнікі дэлегацыі Аргентыны па аказаньню дапамогі яўрэйскаму землеўпарадкаваньню ў СССР. У склад дэлегацыі ўваходзіць Шлейфэр (былы гомельчанін) і С. Эпштэйн. Абодвы дэлегаты зьяўляюцца членамі Аргентынскай камуністычнай партыі.

Гом. Озэт арганізаваў 18 жніўня вялікі мітынг, на якім дэлегаты выступалі з дакладам. Апроч таго, дэлегаты выступяць на рабочых сходах і азнаёмяцца з работаю калгасаў акругі.

У бліжэйшыя дні адчыняюцца курсы па перападрыхтоўцы 75 рахунковых працаўнікоў.

АКРУГОВЫ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ СЕЛЬГАСТАВАРЫСТВА.

ВОРША, 20-8. Пачалася падрыхтоўчая праца па правядзеньню акруговага конкурсу на лепшае сельска-гаспадарчае таварыства. Створана камісія, якой даручана скласьці плян працы і правядзеньня конкурсу, а таксама ёй даручана правесьці і ўсю падрыхтоўчую работу, уцягнуўшы ў гэта райвыканкомы, сельсаветы, прафарганізацыі, пайнікаў, вясковы актыў і іншыя грамадзкія арганізацыі.

Мэта і задачы рабоча-сялянскага радыё-унівэрсытэту

Наша гаспадарка перажывае зараз паласу сацыялістычнай рэканструкцыі. У гэту грандыёзную па сваіх разьмерах і абхвату працу ўцягнуты мільёны рабочых і сялян. І ня дзіўна, што зараз як ніколі вырасла ў масах вялікае жаданьне набыцьця ведаў, такое сапраўды гіганцкае жаданьне павысіць свой агульны і грамадзка-палітычны культурны ўзровень. Мы гэта зьявішча назіраем ня толькі сярод актыву, але таксама і сярод шырокай масы радавых будаўнікоў, ня толькі ў моладзі, але і ў дарослых. Сталыя вучэбныя ўстановы ня маюць магчымасьці ўсю гэту аграмадную масу ахапіць. Адсюль вынікае вялізарная роля завочнага навучаньня. І мы сапраўды бачым, як гэта форма навучаньня з кожным годам усё больш і больш пашыраецца.

Аднэй з навейшых форм завочнага навучаньня—ёсьць рабоча-сялянскі радыё-унівэрсытэт. Гэтыя унівэрсытэты існуюць ужо ва ўсіх буйных рэспубліках СССР. З пачатку гэтага году пачаў працаваць таксама ў Беларусі гэты унівэрсытэт. Мы маем ужо некія вынікі яго працы за 3-4 месяцы. І трэба адзначыць, што вопыт яго працы, ня гледзячы на тое, што нам яшчэ ня ясны многія бакі працы гэтай новай навучальнай установы,—вопыт падкрэсьлівае сур'ёзнасьць гэтай новай формы завочнага навучаньня.

Мы зараз ужо распрацавалі прыблізны вучэбны плян, намецілі мэтады працы радыё-унівэрсытэту. Бязумоўна, нам прыдзецца яшчэ ня раз перапрацоўваць наш вучэбны плян і палепшаць мэтады працы унівэрсытэту. Мы глядзім на нашу сучасную працу як на першыя крокі распрацоўкі больш сталых форм, зьместу і мэтадаў працы.

Рабоча-сялянскі радыё-унівэрсытэт будзе мець сваю сталую аудыторыю. Гэта, бязумоўна, ня значыць, што нашы лекцыі ня змогуць слухаць не слухачы унівэрсытэту. Але гэты кадр слухачоў мы ня будзем абслугоўваць усім апаратам радыё-унівэрсытэту, як рэцэнзія, консультацыя і г. д.

Наш унівэрсытэт будзе 2-хгадовы. У яго будуць прымацца слухачы, якія маюць падрыхтоўку ня ніжэй 4-хгодкі.

Які вучэбны плян мы распрацавалі?

У нашым вучэбным пляне ёсьць шэраг дысцыплін, якія абавязковы для слухачоў 2-х факультэтаў унівэрсытэту (прамысловы для рабочых, сельска-гаспадарчы—для сялян). Гэтыя агульныя прадметы наступныя: гісторыя клясавай барацьбы, паліт-эканомія, эканом-гэографія, экан.-палітыка, дыялектычны матар'ялізм, гісторыя УсеКП(б) і КП(б)Б, ленінізм, хэмія, фізіка, біялёгія.

Сярод дысцыплін, якія будуць зачытвацца на прамысловым факультэце, мы маем наступныя: стандарт прамысловых прадпрыемстваў, становішча прамысловасьці ў капіталістычных краінах, прамысловасьць СССР і БССР, прамысловасьць па 5-цігадовому пляну, энэргетычныя рэсурсы СССР, электрыфікацыя, тэхналёгія і таваразнаўства, рацыяналізацыя прамысловасьці.

Дысцыпліны, якія будуць зачытвацца на сельска-гаспадарчым факультэце, наступныя: Асновы сельска-гаспадарчай эканоміі, сыстэма сельскай гаспадаркі і паляводства, землеўпарадкаваньне, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, паляводства, жывёлагадоўля, мэліярацыя, садова-гародныя культуры, дадатковыя прыбыткі сельскай гаспадаркі, лясная гаспадарка, пяцігадовы плян па сельскай гаспадарцы.

Як мы бачым з гэтых дысцыплін, рабоча-сялянскі унівэрсытэт лічыць сябе зброяй узмацненьня індустрыялізацыі нашай прамысловасьці і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Вось пад гэтым кутам гледжаньня будуць чытацца дысцыпліны ў рабоча-сялянскім унівэрсытэце.

Якім мэтадам мы будзем працаваць? Кожны лектар будзе зачытваць сваю лекцыю па радыё. Пасьля лекцыі мы будзем дасылаць заданьні па кожнай лекцыі кожнаму нашаму слухачу, які павінен будзе дасылаць нам сваю пісьмовую кантрольную працу па данаму заданьню. Пры намечаньні колькасьці кантрольных прац мы будзем улічваць тое, што нашы слухачы заняты сваёй штодзённай працай, але так, каб гэта ня шкодзіла таксама ходу ўсёй нашай вучэбнай працы. Мы таксама намячаем к канцу году канфэрэнцыю слухачоў, на якой мы праверым вынікі гадавой працы. Кожны слухач будзе атрымоўваць ад лектароў ацэнку сваёй працы. Мы таксама арганізуем жывую кансультацыю, дзе кожны слухач будзе мець магчымасьць атрымаць адказы на кожнае сваё пытаньне, зьвязанае з вучобай яго працы.

Унівэрсытэт разьлічан ня толькі на слухачоў, якія маюць свае ўласныя радыёпрыёмнікі. Мы лічым, што кожны клюб, або хата-чытальня, дзе ёсьць радыёпрыёмнікі, павінны арганізаваць групы слухачоў нашага радыё-унівэрсытэту. Гэта праца павінна ўвайсьці ў плян працы кожнага клюбу, або хаты-чытальні, прычым трэба арганізаваць так, каб слухач меў магчымасьць слухаць і распрацоўваць свае заданьні. Трэба, каб клюбы, або хаты-чытальні павялі агітацыю сярод рабочых і сялян нашага унівэрсытэту і былі арганізатарамі груп слухачоў.

Мы імкнемся, каб у нашым унівэрсытэце чыталі свае лекцыі найбольш кваліфікаваныя навуковыя працаўнікі Беларусі. Мы спадзяемся, што ў гэтым напрамку нам пойдзе насустрач цэнтральнае бюро навуковых працаўнікоў.

Мы зараз пачынаем набор слухачоў унівэрсытэту. Наша асноўная задача ў тым, каб папулярызаваць унівэрсытэт у шырокіх колах рабочых і сялян. Гэту задачу павінны ўзяць на сябе ўсе партыйныя і грамадзкія арганізацыі, а таксама і нашы ўжо старыя слухачы. Мы павінны мець шырокую аўдыторыю слухачоў.

Наша ўстанова ня рыхтуе спэцыялістаў па тэй ці іншай вузкай спэцыяльнасьці, але, бязумоўна, тыя веды, якія будзе атрымоўваць наш слухач, дадуць яму магчымасьць працягваць сваю вучобу ў тэй ці іншай сталай навучальнай установе.

Р. Кугель.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зацьверджаньне палажэньня пра падатак з маемасьці, якая пераходзіць у спадчыну і дар.

На падставе пастановы ЦВК і СНК СССР за 6 лютага 1929 г. „пра падатак з маемасьці, якая пераходзіць у парадку спадчыны і дараваньня“ (З. З. СССР 1929 г., № 8, арт. 78) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Зацьвердзіць палажэньне пра падатак з маемасьці, якая пераходзіць у спадчыну і дар.

2. Пашырыць гэтае палажэньне на спадчыны, якія выяўляюцца з 1 кастрычніка 1929 г., а таксама на маемасьць, якая пераходзіць у дар паводле актаў, учыненых з таго самага часу.

3. З часу ўваходу ў сілу палажэньня скасаваць наступныя пастановы СНК БССР:

а) за 1 ліпеня 1926 г. „аб паданьні зьвестак аб адчыніўшыхся спадчынах“ (З. З. БССР 1926 г., № 26, арт. 96) і

б) за 29 лістапада 1926 г. „аб дапаўненьні пастановы СНК аб паданьні зьвестак аб адчыніўшыхся спадчынах“ (З.З. БССР 1926 г., № 49, арт. 185).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Час. Вык. абав. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчаўчага Камітэту БССР **А. Вараўка.**

10 жніўня 1929 г.
г. Менск.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

пра падатак з маемасьці, якая пераходзіць у спадчыну і дар.

1. Маемасьць, якая пераходзіць у спадчыну, абкладаецца падаткам.

2. З маемасьці, якая належыць замежным грамадзянам, калі гэтая маемасьць знаходзіцца ў межах БССР і пераходзіць у спадчыну да замежных грамадзян ці грамадзян Саюзу ССР, падатак бярэцца на агульных падставах, калі няма спэцыяльных дагавораў з адпаведнымі дзяржавамі.

3. Падаткам не абкладаюцца спадчыны, кошт якіх не перавышае 1000 рублёў, а таксама спадчыны, якія перадаюцца па тэстаманту ўстановам, прадпрыемствам і арганізацыям, пералічаным у арт. 460 Грамадзянскага Кодэксу.

4. У спадчынную маемасьць для абкладаньня падаткам не ўключаюцца:

а) прадметы звычайнага хатняга абсталяваньня і ўжытку (апроч прадметаў роскашы);

б) страхавыя сумы, якія павінны выдавацца паводле дагавору асабовага страхаваньня;

в) аўтарскія правы і патэнты на выналадкі, якія пераходзяць да насьледнікаў аўтара;

г) уклады спадчынадаўца ў дзяржаўных працоўных ашчадных касах;

д) права забудоўкі на пляцы, што даюцца для будаваньня жылых будынкаў, паводле пастановы СНК СССР за 17 красавіка 1928 г.

„Пра захады да заахвочваньня будаваньня жылішч за кошт прыватнага капіталу“ (З. З. СССР 1928 г. № 26, арт. 231);

е) акцыі акцыйных таварыстваў, паказаных у арт. 2, паі таварыстваў узаемнага крэдыту, прадугледжаных арт. 6 паказанай вышэй пастановы СНК СССР за 17 красавіка 1928 г. (З. З. СССР 192. г., № 26, арт. 231 і № 42, арт. 380).

5. З кошту спадчыннай маемасьці для абкладаньня падаткам выключаюцца:

а) заработная плата рабочым і служачым, а таксама завінавачанасьці па сацыяльным страхаваньні;

б) плата за мэдычную дапамогу і за нагляд у час прадсьмертнай хваробы асобы, якая пакінула спадчыну;

в) выдаткі на пахаваньне спадчынадаўца;

г) сумы, якія належаць з спадчынадаўца па падатках з пеняю і штрафам на дзень выяўленьня спадчыны;

д) пацьверджаныя дакумэнты ці ўстаноўленыя ў судовым парадку даўгі спадчынадаўца, забясьпечаныя і незабясьпечаныя заставаю ў разьмеры невыплачанай на дзень выяўленьня спадчыны капітальнай сумы з процантамі, апроч даўгоў насьледнікам.

6. Даўгі, выплата якіх залежыць ад якой-небудзь умовы, а таксама даўгі, якія ўстанаўляюцца ў судовым парадку—пасьля выяўленьня спадчыны, не выключаюцца з кошту маемасьці, але калі надышла ўмова ці ўвайшла ў сілу пастанова суда, лішне спагнаная сума падатку павінна быць вернута.

7. Падатак са спадчыны вылічаецца фінансавымі аддзеламі акруговых выканаўчых камітэтаў.

8. Падатак вылічаецца з кошту спадчыннае маемасьці на дзень выяўленьня спадчыны, паводле дададзенай да гэтага палажэньня табліцы.

9. Падатак са спадчыны павінен быць унесен насьледнікамі, з якіх налічан падатак, цалкам на працягу аднаго месяца ад дня атрыманьня імі абвяшчэньня пастановы фінансавага аддзелу аб вылічэньні падатку. Падатак налічаецца на кожнага насьледніка прапарцыянальна яго часткі ў спадчыннай маемасьці.

10. Калі тэстамантам спадчынадаўца ўскладаецца на насьледнікаў установы, прадпрыемствы і арганізацыі ўтрыманьне альбо якая-небудзь іншая матарыяльная дапамога аднэй альбо некалькім з паказаных у арт. арт. 459 і 460 Грамадзянскага Кодэксу асоб, то падатак, які належыць з гэтай часткі маемасьці, выплачваецца насьледнікамі і арганізацыямі, не вызваленымі ад падатку (арт. 2) але ім даецца права пры выдачы маемасьці асобе, якой яна адказана, вылічыць належную з гэтае маемасьці суму падатку. Адказаная маемасьць можа выдавацца толькі пасьля выплаты падатку са спадчыны.

11. З маемасьці, якая пераходзіць у спадчыну пасьля надыходу пэўнай умовы альбо тэрміну, падатак выплачваецца праз месяц пасьля фактычнага пераходу да насьледніка адпаведнай маемасьці.

12. На пастановы фінансавых аддзелаў акруговых выканаўчых камітэтаў аб налічэньні падатку могуць падавацца насьледнікамі скаргі ў тыя самыя фінансавыя аддзелы на працягу двох тыдняў ад дня абвяшчэньня імі пастановы.

13. Скаргі, якія будуць прызнаны фінансавымі аддзеламі, што іх трэба цалкам ці часткова задаволіць, пераглядаюцца самымі фінансавамі аддзеламі. Калі-ж скаргі фінансавымі аддзеламі не будуць цалкам ці часткова задаволены, то гэтыя скаргі, па хадайніцтву насьледнікаў, якія падалі скаргі, пасылаюцца на працягу двох тыдняў ад дня падачы скаргі на разгляд належнага народнага суда.

14. Падача скаргі не прыпыняе спагнаньня падатку, але калі платнікі хадайнічаюць аб адтэрмінаваньні ці растэрмінаваньні падатку, то такое хадайніцтва разглядаецца на агульных падставах паводле палажэньня аб спагнаньні падаткаў.

15. Аб кожнай спадчыннай маёмасьці, незалежна ад сумы спадчыны, асобы, якія атрымалі спадчыну, павінны не пазьней як праз месяц ад дня прыняцьця спадчыны падаць у адпаведны фінансавы аддзел заяву, паказаўшы склад маемасьці.

16. Калі насьледнік атрымае маемасьць, якая была не выяўлена пры падачы першапачатковай заявы аб спадчыне, то, не пазьней як праз месяц ад дня прыняцьця гэтай дадатковай маемасьці, насьледнік павінен падаць дадатковую заяву, паказаўшы склад яе.

17. Аб сьмерці асобы, пасьля якой асталася спадчына, у гарадох—жыліхчныя таварыствы, дамакіраўніцтвы, арэндатары і да т. п., а ў сельскіх мясцовасьцях адпаведныя саветы павінны на працягу месяца падаць у фінансавы аддзел акруговага выканаўчага камітэту весткі, дадаўшы сьпіс маёмасьці.

18. Фінансавыя аддзелы акруговых выканаўчых камітэтаў маюць права патрабаваць ад дзяржаўных, грамадзкіх і прыватных установ, прадпрыемстваў і арганізацыі і ад службовых асоб весткі аб усей спадчыннай маемасьці, аб якой у гэтых установах, прадпрыемствах і арганізацыях ёсьць даныя, а таксама фінансавыя аддзелы маюць права разглядаць справы, якія тычацца гэтай маемасьці.

19. Усе судовыя і адміністрацыйныя ўстановы і службовыя асобы павінны паведамляць фінансавым аддзелам акруговых выканаўчых камітэтаў аб выяўленых імі выпадках пераходу ў спадчыну маемасьці, калі з справаводзтва не відаць, што падатак ужо выплачан.

20. Народныя суды і судовыя выканаўцы паведамляюць фінансавым аддзелам акруговых выканаўчых камітэтаў аб усіх даных пра справы аб ахове маемасьці, сьпісы маемасьці, пастановы суда і г. д.

21. Судовыя, адміністрацыйныя, крэдытныя і грамадзкія ўстановы і службовыя асобы могуць перадаваць насьледнікам капіталы ці іншую маемасьць ня інакчай, як пасьля падачы насьледнікамі пасьведчаньняў фінансавых аддзелаў акруговых выканаўчых камітэтау аб тым, што імі атрымана адпаведная заява аб складзе гэтай маемасьці. Патрабаваньні, паказаныя ў гэтым артыкуле ня тычацца працоўных ашчадных кас.

22. За непадачу вестак, паказаных у арт. арт. 17-21 гэтага палажэньня службовыя асобы прыцягваюцца да адказнасьці ў крымінальным парадку.

23. За непадачу вестак насьледнікамі ці выканаўцамі тэстаманту (арт. арт. 15 і 16) на насьледнікаў альбо выканаўцаў тэстаманту пастановамі фінансавых аддзелаў акруговых выканаўчых камітэтаў накладаецца штраф да 300 руб., які залічаецца ў даход дзяржаўнага бюджэту. Калі сума спадчыны не перавышае 1000 руб., то ўстановы, прадпрыемствы, арганізацыі, службовыя асобы, а таксама насьледнікі і выканаўцы тэстаманту да адказнасьці за непадачу ў тэрмін заявы аб спадчыне не прыцягваюцца.

24. Падатак з маемасьці, якая пераходзіць у дар, бярэцца паводле арт. арт. 1, 7, 9-14 гэтага палажэньня.

25. Падатак бярэцца ў павялічаным разьмеры ў параўнаньні з стаўкамі, паказанымі ў ідаданай табліцы, з кошту ўсяе маемасьці, якая пераходзіць у дар.

26. Кошт маемасьці вызначаецца на дзень учыненьня акту дарэньня. З кошту маемасьці вылічаюцца даўгі і невыплачаныя падаткі (да дня ўчыненьня акту дарэньня), якія належаць з маемасьці. Паказаныя даўгі і падаткі павінны плаціцца асобамі, якія атрымліваюць дар.

27. Падатак не бярэцца з маемасьці, якая пераходзіць паводле актаў дарэньня на суму менш 1000 рублёў, і з сум, ахвяраваных на карысьць дзяржаўных установ і прадпрыёмстваў, партыйных, прафэсыйных і іншых грамадзкіх арганізацый, а таксама каапэрацыйных арганізацый, якія ўваходзяць у каапэрацыйны саюз.

28. Натарыяльныя канторы павінны на працягу двух тыдняў ад дня ўчыненьня акту пасылаць у адпаведны фінансавы аддзел копію акту дарэньня.

29. Аб кожнай маемасьці, якая пераходзіць паводле акту дарэньня, асоба, да якой пераходзіць дар, павінна падаць заяву ў фінансавы аддзел на працягу месяца ад дня прыняцьця дара.

30. Спадчынная маемасьць пераходзіць да дзяржавы:

а) калі маемасьць прызнана адмерлаю (арт. арт. 464 і 465 Грамадзянскага Кодэксу);

б) калі насьледнік не атрымае сваю часткі на працягу 6 месяцаў (арт. 478 Грамадзянскага Кодэксу);

в) калі будзе выяўлена маемасьць, якая асталася пасьля памерлых да 1 сакавіка 1926 г. у частцы, што перавышае 10.000 руб., якая ня можа пераходзіць у спадчыну.

31. Адмерлая маемасьць перадаецца дзяржаве на падставе пастановы ЦВК і СНК СССР за 28 мая 1927 г. „Пра парадак скарыстаньня канфіскаванай адмерлай і нічые маемасьці“ (З. З. СССР 1927 г., № 32, арт. 323).

32. Калі да дзяржавы пераходзіць частка спадчыны, то маемасьць падзяляецца адным з наступных спосабаў:

а) насьледнікі выкупляюць тую частку спадчыны, якая належыць дзяржаве;

б) дзяржава выкупляе тую частку спадчыны, якая належыць насьледнікам;

в) маемасьць дзеліцца ў натуры;

г) маемасьць, якую нельга падзяліць, прадаецца з таргоў.

33. Для выдзяленьня долі, якая належыць дзяржаве, фінансавы аддзел акруговага выканаўчага камітэту робіць падзел маемасьці.

34. Складзены фінансавым аддзелам акруговага выканаўчага камітэту акт падзелу спадчыннай маемасьці падпісваецца прадстаўніком фінансавага аддзелу і усімі пасьледнікамі.

35. Калі насьледнікі адмовяцца падпісаць акт аб падзеле маемасьці, то фінансавы аддзел акруговага выканаўчага камітэту перадае справу не пазьней як праз два тыдні на канчатковае вырашэньне адпаведнага народнага суду.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Час. вык. абав. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Вараўка.**

10 жніўня 1929 году.
г. Менск.

ТАБЛІЦА № 1

ставак падатку з маемасьці, якая пераходзіць у спадчыну да ўсіх асоб, апроч тых, якія абкладаюцца падаходным падаткам паводле раскладу № 3 ставак падаходнага падатку (З. З. Саюзу ССР 1928 г., № 1, арт. 2).

Кошт маемасьці	Вялічыня падатку				
Звыш 1000 р. да 2000 р.	1 проц.				
„ 2000 р. „ 6000 р.	З першых 2000 р.	20 р.	з рэшты сумы звыш перш.	2000 р.	5 проц.
„ 6000 р. „ 10000 р.	„ 6000 р.	220 р.	„ „ „ „	6000 р.	8 „
„ 10000 р. „ 40000 р.	„ 10000 р.	540 р.	„ „ „ „	10000 р.	10 „
„ 40000 р. „ 100000 р.	„ 40000 р.	3540 р.	„ „ „ „	40000 р.	25 „
„ 100000 р. „ 200000 р.	„ 100000 р.	18540 р.	„ „ „ „	100000 р.	40 „
„ 200000 р. „ 500000 р.	„ 200000 р.	58540 р.	„ „ „ „	200000 р.	60 „
„ 500000 р.	„ 500000 р.	238540 р.	„ „ „ „	5 0000 р.	90 „

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. КАРКЛІН.
Час. вык. абав. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ВАРАЎКА.

ТАБЛІЦА № 2

ставак падатку з маемасьці, якая пераходзіць у спадчыну да асоб, што абкладаюцца падаходным падаткам паводле раскладу № 3 ставак падаходнага падатку

Кошт маемасьці	Вялічыня падатку				
Звыш 1000 р. да 2000 р.	5 проц.				
„ 2000 р. „ 6000 р.	З першых 2000 р.	100 р.	з рэшты сумы звыш першых	2000 р.	10 проц.
„ 6000 р. „ 10000 р.	„ 6000 р.	500 р.	„ „ „ „	6000 р.	15 „
„ 10000 р. „ 40000 р.	„ 10000 р.	1100 р.	„ „ „ „	10000 р.	20 „
„ 40000 р. „ 100000 р.	„ 40000 р.	7100 р.	„ „ „ „	40000 р.	25 „
„ 100000 р. „ 200000 р.	„ 100000 р.	22100 р.	„ „ „ „	100000 р.	40 „
„ 200000 р. „ 500000 р.	„ 200000 р.	62100 р.	„ „ „ „	200000 р.	65 „
„ 500000 р.	„ 500000 р.	257100 р.	„ „ „ „	500000 р.	90 „

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. КАРКЛІН.
Час. вык. абав. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ВАРАЎКА.

Гр-н Кумагер Антось Сяргееў, які паходзіць з гр-н Стара-Дарожскага р-ну, Бабруйскай акругі.
зьмяняе сваё імя і прозьвішча
—КУМАГЕР АНТОСЬ
на прозьвішча і імя—
ІВАНОЎ АРКАДЗІ.
Асоб, які маюць пратэсты супроць зьмены імя і прозьвішча, просьба паведаміць аб гэтым Бабруйскі Акруговы ЗАГС, паказаўшы свае імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыхарства.

Гр. Шая (Аляксандр) Меер-Іёселевіч Міркінд, нараджэньня 1905 г., які паходзіць з гр. с. Навозы, Чарнігаўскай акр. і жыве ў м. Шклове, Маг. акр., Інтэрнацыянальная вул. № 72, зьмяняе сваё імя Шая (Аляксандр) на імя Аляксандар і прозьвішча Міркінд на прозьвішча Навераў.
Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены імя і прозьвішча—просяць паведаміць аб гэтым Магілеўскі акруговы ЗАГС, паказаўшы сваё прозьвішча, імя і імя па бацьку, а таксама і месца пражываньня.

Полацкі акр. Загс выклікае на 25-е жніўня г. г. гр-на
Маскаленка Ігната Восіпава
па справе аб скасаваньні шлюбу з гр-кай **Маскаленка Кацярынай Хведаравай.**

ЗГУБЛЕНЫ.

— Вучотна-конская картка Рэута І. П.—выд. Чэрвенскім РВК, кв. № 813.
— Вучотна-конская карт. Ладуцька Ю.Я.—выд. Чэрвенскім РВК, кв. № 813.
— Вучотна-конская карт. Падавіковіча Н. Г.—выд. Чэрвенск. РВК, кв. № 813.

Галоўлітбел 595

Што патрабуюць рабочыя масы ад кіно.

Кіно-канфэрэнцыя, якая гэтымі днямі была склікана ў Менску, зьяўляецца першым крокам, калі справу кіно перадаецца на абмяркаваньне шырокіх колаў працоўных мас.

Асаблівасьцю гэтае канфэрэнцыі зьяўляецца тое, што большасьць дэлегатаў яе зьяўляліся рабочыя. Вось чаму іх крытыка нашага кіно зьяўлялася адбіткам настрояў шырокіх рабочых гушчаў.

Ня гледзячы на посьпехі, нашае кіно мае яшчэ шмат недахопаў. І на гэтых недахопах спыняліся дэлегаты.

Да гэтага часу рабочаму часта падносяцца такія карціны, у якіх няма жаднай ідэолёгіі. Асабліва гэта адносіцца да замежных фільмаў, дзе апрача пікантных відавых карцін і мастацкага афармленьня нічога няма. Але часта і нашы савецкія карціны мала-што даюць гледачу. Возьмем хоць-бы такія карціны, як „Новы Бабілён“, „Арсэнал“. Ніхто ня будзе спрачацца, што гэта высока-мастацкія карціны, што яны каштоўны па свайму ідэолёгічнаму зьместу, але недахопам іх зьяўляецца тое, што наша публіка не падрыхтавана да такіх „карцін, трэба загадзя пазнаёміць гледача з напрамкамі кіно-перадачы фактаў, якія ў гэтых карцінах часта застаюцца незразумелымі.

Тое самае можна сказаць і аб грамадзкім праглядзе нашых кіно-фільмаў. Яны павінны праглядацца ня ў Доме Культуры ці ў іншым кіно-тэатры, але на фабрыках і заводах. Вялікім недахопам Белдзяржкіно зьяўляецца і тое, што папярэдня ня ўносіцца на абмяркаваньне мас сам сцэнары. Тады ўжо не паможа грамадзкі прагляд, калі на карціну выкідаюць па сто тысяч руб., абмеркаваньне сцэнарыяў на рабочых сходах можа папярэдзіць такія ляпсусы.

Шмат скаргаў было і на тое, што ў рабочых клюбах няма адпаведнага падбору карцін. Няма магчымасьці падрыхтаваць рабочага гледача да тэй ці іншай карціны, бо невядома, калі яна будзе атрымана; кожны фільм павінен уперад дэманстравацца ў платных кіно, а потым ужо паступае ў клюб.

Зусім слушна, што пры такіх парадках нельга вясьці працу па падрыхтоўцы рабочага гледача.

Дзеля таго, каб даць магчымасьць больш уцягнуць у кіно шырокія масы працоўных трэба панізіць цэны на білеты, бо існуючыя цэны даволі высокія. Мала гэтага, —кіно-тэатры трэба будаваць і на акраінах. Ці па кішэні гэта рабочаму прыехаць з сваей жонкай на аўтабусе з Камароўкі ў Дом Культуры і ўзяць яшчэ па білету хоць-бы па 30-35 кап.? Зразумела, што не. Пара спыніць такі парадак кіно-будаўніцтва калі шыкозныя кіна-тэатры будуюцца ў цэнтры гораду, а на Камароўцы, Сярабранцы і Пярэсьпе нават няма самага скромнага кіно. Чамусьці нават зачынілі „Беларускую Хатку“ каля конскага базару, дзе ўперад прыгарадныя сяляне, рабочыя масы Камароўкі мелі сваё кіно. А за блізкі-сьвет, каб толькі паглядзець кіно, мала хто з акраін пацягнецца ў цэнтр.

Былі заўвагі адносна рэпэртуару дзіцячага кіно. Белдзяржкіно мала што зрабіў, каб папулярызаваць гэта кіно. Калі-ж узяць сам рэпэртуар гэтага кіно, дык у ім вельмі мала спэцыяльных дзіцячых фільмаў. Замест карцін на прырода-знаўчыя тэмы, з рознымі зьвярмі, птушкамі ды інш., чаго дзеці вельмі любяць, Белдзяржкіно ўключае ў „дзіцячы“ рэпэртуар такі фільм, як „Броненосец Потемкин“, які зьяўляецца далёка ня дзіцячым.

Белдзяржкіно ў далейшым павінна больш адбіваць у сваіх фільмах наша гаспадарчае і культурнае будаўніцтва: арганізацыю калгасаў, асушэньне балот і г. д. Пакуль што мы мала маем такіх фільмаў трэба таксама ўстанавіць больш уважлівы выбар карцін, якія пасылаюцца для дэманстраваньня ў вёску. Адзін дэлегат праводзіў прыклад, калі ў глухой вёсцы дэманстравалі карціну „Господа Скотинины“, якую сялянства не зразумела.

СУД.

Забойства старшыні малочнай арцелі.

Недранская малочная арцель, Заслаўскага раёну была арганізавана па ініцыятыве вяскога актывіста бедняка Фадзеява. Арцель з году ў год разьвівалася. Абраны старшынёю арцелі Фадзеяў працаваў сумленна і сяляне даверылі яму кіраўніцтва арцельлю, як лепшаму барацьбіту за лепшае жыцьцё вёскі. Адначасова ў арцелі працавалі: Казлоўскі, Міллановіч і Макарэвіч—рабочымі і Тадор Пепік—майстрам па малочнай справе. Пры вытварэньні розных разьлікаў і апэрацыях арцелі Казлоўскі вельмі часта прыкмячаў у старшыні праўленьня Фадзеява значныя сумы грошай і заўсёды ў яго паўставала думка абрабаваць Фадзеява, але зрабіць гэтага злачынства адзін Казлоўскі не рашаўся.

Аднойчы ў таварыскай гутарцы за чаркай гарэлкі Казлоўскі перадаў сваю думку Пепіку, Міллановічу і Макарэвічу, якія адразу на рабунак згадзіліся і тады сталі рыхтавацца і распрацоўваць план рабунку, але падбухторшчык Казлоўскі ад удзелу ў рабунку адмовіўся.

Тадор Пепік заўсёды ведаў наяўнасьць грошай у Фадзеява. Папярэдня ўмовіўшыся з Макарэвічам і Міллановічам рашылі абрабаваць Фадзеява ў трох. На працягу 2 тыдняў яны зрабілі дзьве засады з мэтай абрабаваць Фаддзеява, але засады не дасягнулі сваей мэты па аб'ектыўных прычынах.

Уначы на 3 чэрвеня г. г. Пепік, Міллановіч і Макарэвіч, узброенныя адрэзам і сякерамі, зрабілі апошнюю засаду на шляху паміж вёскамі Шчарбін і Гарош[illegible], ведаючы, што Фадзеяў будзе зварачацца з грашмі да хаты. Калі Фадзеяў падышоў к месцу засады, бандыты раптам накінуліся на Фадзеява—прычым Макарэвіч зрабіў стрэл у грудзі Фаддзеяву, а Пепік і Міллановіч сякерамі канчаткова скончылі жыцьцё Фадзеява, абрабаваўшы потым 410 р. арцельных грошай.

Сяргей Раманоўскі за чатыры дні да рабунку даў Макарэвічу патроны і, ведаючы аб злачынстае, да ведама адпаведных сьледчых органаў не давёў, злачынства гэта захаваў.

Галоўным кіраўніком банды зьяўляўся Тадор Пепік.

Справа разглядалася ў Заслаўскім Надоме 16 і 17 жніўня з удзелам пракурора і абароны. На судзе прысутнічала шмат сялян вёсак Заслаўскага раёну.

Суд прыгаварыў:

Тадора Іванава Пепіка—да вышэйшай меры абароны—на растрэл.

Міколу Макарэвіча і Алеся Міллановіча па дзесяці год зьняволеньня кожнага з суровым адмежаваньнем, пазбаўленьнем у правах на пяць год і высылкай з межаў акругі на пяць год.

Казлоўскі Мікола і Раманоўскі Сяргей прыгавораны на 8 год зьняволеньня з пазбаўленьнем у правах: Казлоўскага на два гады і Раманоўскага на адзін год—высылкай Казлоўскага з акругі на пяць год па адбыцьці пакараньня. Прымаючы пад увагу некаторых акалічнасьці меры абароны Казлоўскаму скарочана да пяці год, Раманоўскаму з 2-х год з вынікам па прыгавору.

Прыгавор насельніцтва спаткала са задавальненьням.

Д. Кастроў.

ХРОНІКА.

Задачы прафсаюзаў у правядзеньні прызыву 1907 г.

Правядзеньне прызыву ў Чырвоную армію ў мінулым годзе выявіла, што прафсаюзныя органы не заўсёды прымалі належны ўдзел у падрыхтоўчай працы. Так акруговыя профбюро недастаткова ўважліва адносіліся да вылучэньня сваіх прадстаўнікоў у прызыўныя камісіі, былі выпадкі несвоечасовай яўкі на прызыў членаў прафсаюзаў, бо з імі была слаба праведзена папярэдняя праца. Слаба таксама прафсаюзы дапамаглі ў выяўленьні сацыяльна чуждых элемэнтаў, каб не дапусьціць іх у нашу армію. Ня зусім належна саюзы прымалі ўдзел і ў падборы лепшых кандыдатаў рабочых для накіраваньня ў вайсковыя школы.

Каб не паўтарыць памылак мінулых гадоў ЦСПСБ даў на месцы шэраг практычных указаньняў. Нізавым прафарганізацыям неабходна правесьці сходы прызыўнікаў сумольна з рабочай моладзьзю. На сходах павінны быць абгавораны пытаньні чаргового прызыву ў Чырвоную армію, увязваючы з пытаньнем растлумачэньня міжнароднага становішча, высьвятляючы значэньне Чырвонай арміі, яе быт, вучобу і традыцыі.

У клюбах і чырвоных кутках будуць праводзіцца гутаркі на гэтыя-ж тэмы, чытка адпаведнай літаратуры, будуць наладжвацца вечары, экскурсіі у казармы, лягеры. Задачы і мэты прызыва павінны адбівацца ў пасьценгазэтах, лёзунгах і плякатах, кампанію па прызыву неабходна нашым прафсаюзам скарыстаць для пашырэньня работы па ваенізацыі рабочых і наогул членаў суюзу.

ЦП Саюзаў і Акрпартбюро праз фабзавмяцкомы павінны дабіцца максымальнага ўдзелу членаў саюзу ў выяўленьні сацыяльна-чуждых элемэнтаў, трэба дабіцца таго, каб ніводзін варожы нам элемэнт не папаў ў шэрагі Чырвонай арміі. Асабліва завастрыць увагу на гэтым пытаньні павінны прафсаюзы, працуючыя ў вёсцы.

Побач з гэтым перад профарганізацыямі стаіць задача—падрыхтаваць рабочую грамадзкасьць да арганізацыі спатканьня вясковых прызыўнікаў, наладзіць абслугоўваньне апошніх клюбамі, пастаноўкамі, кіносэансамі, літаратурай і газэтамі. Усе выезды шэфаў, рабочых брыгад у вёску павінны быць скарыстаны для наладжваньня працы з вясковымі прызыўнікамі.

На будаўніцтве трамваю.

Пракладка трамвайных шляхоў ідзе к канцу. У бліжэйшым часе распачынаюцца работы па пракладцы трамвайных рэяк з Пляцу Волі на Старажоўку. Ідзе таксама поўным ходам работа па пракладцы паветранай лініі. Распачаты работы па пракопцы катлаванаў на трамвайным парку. Абсталяваньне для электрычнай падстанцыі ўжо атрымана і работа па яе абсталяваньню падыходзіць к канцу. У другой палове верасьня прыбудуць першыя адзесяць трамвайных вагонаў і трамвайны рух мяркуецца пусьціць у канцы верасьня.

Новая прафшкола малочнай гаспадаркі.

Беліцкая сельска-гаспадарчая школа ў Віцебскай акрузе рэарганізуецца з новага навучальнага году ў прафшколу малочнай гаспадаркі. Прафшкола будзе рыхтаваць майстроў сыраварў-масляробаў.

Уцягнуць усіх рабочых у рэалізацыю пазыкі.

Цэнтральнае праўленьне саюзу хімікаў абгаварыла вынікі ходу кампаніі па рэалізацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі на фабр. „Дняпро“ і „10-ы Кастрычнік“. Пакуль што на гэтых фабрыках на пазыку падпісалася 1232 чалав., або 67 проц. агульнага ліку рабочых. Падпіска дала 77160 руб. Такі тэмп па правядзеньню кампаніі па падпісцы на пазыку прызнаць здавальняючым—нельга. Прэзыдыум ЦП саюзу хімікаў запрапанаваў фабкомам гэтых фабрык прыняць усе меры да поўнага ахопу рабочых падпіскай на пазыку.

Абсталяваньні для крухмальных заводаў.

На Менскім чыгуна-ліцейным заводзе „Энэргія“ зараз пачалі вырабляць абсталяваньне для крухмальных заводаў.

Гэткія працы выпушчаюцца ўпяршыню ў Савецкім Саюзе.

Як жывуць і змагаюцца фізкультурнікі-рабочыя ў Францыі.

У Менск, як было паведамлена нашай газэтай, прыехаў сябр спортінтэрну, сакратар францускай фэдэрацыі рабочых фізкультурнікаў т. Рэпэ-Русо.

Рэнэ-Русо па прафэсіі мэталіст, фрэзероўшчык.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам ён падзяліўся думкамі аб стане рабочага фізкультурнага руху ў Францыі.

— З боку рабочых наглядаецца асаблівае жаданьне і інтарэс да фізкультуры. Але буржуазея лічыць, што рабочыя фізкультурныя аб'ядманьні гэта—арганізацыі палітычныя і ўселяк змагаюцца не дапушчаць стварэньні гэткіх гурткоў, прыменяючы нават рэпрэсыйныя захады. Яны дапамагаюцца задушыць рабочы фізкультурны рух у Францыі.

Зараз фэдэрацыя налічвае каля 5 млн. фізкультурнікаў з якіх 60 проц. рабочых. Гурткі існуюць пры кожным заводзе, фабрыцы і ўстанове. Фізкультурныя арганізацыі ахапілі таксама вёскі, дзе налічваецца шмат сялян фізкультурнікаў. У вёсках зараз ідзе барацьба духавенства за аўладаньне моладзьдзю. Духавенства нават прабуе праводзіць сваю агітацыю і сярод рабочых фізкультурных гурткоў. Усё-ж уплыў камуністых заўсёды больш мацнейшы.

За апошні час буржуазны тэрор супроць нас узмацніўся. Паліцыя перашкаджае нашым дэманстрацыям. Наколькі ўзмацнілася рэакцыйнае выступленьне буржуазеі супроць нашых аб'яднаньняў відаць з таго, што з працы звальняюцца рабочыя фізкультурнікі, якія ўваходзяць у нашыя фэдэрацыі.

З вялікімі цяжкасьцямі нам удаецца магчымасьць арганізоўваць фізкультгурткі ў рабочыя раёны, але посьпехі маем вялікія.

Па некаторых раёнах Парыжу мы маем нават сваі фізкультурныя клюбы. Клюбы таксама арганізоўваюцца на больш буйных фабрыках і заводах.

Да апошняга часу мы мелі свой друкаваны орган „Спортыўное Эхо“, але зараз у сувязі з наступленьнем капіталістаў на камуністычныя выданьні, прышлося часова сьпыніць выданьне часопісі часопісь карысталася вялікім посьпехам сярод рабочых фізкультурнікаў. Але трэба спадзявацца, што ў хуткім часе нашае рабочае спортыўнае выданьне зноў паявіцца ў рабочых раёнах Парыжу і ўсёй Францыі.

Ма.

Пакрытыя пылам тысячагодзьдзя.

Археолёгічныя экспэдыцыі, якія сёлета арганізавала БАН для вывучэньня помнікаў старажытнасьці ў некаторых раёнах БССР, выявілі шмат цікавага і каштоўнага для навукі. Крок за крокам выяўляюцца ўсё новыя і новыя дэталі, новыя факты, якія даюць магчымасьць чытаць старонкі мінулага з гісторыі нашай бацькаўшчыны.

У працах экспэдыцый прымалі ўдзел археолёгі: т. т. Дубінскі, Ляўданскі, Палікарповіч. Апроч гэтага, да гэтай справы былі прыцягнуты маладыя дасьледчыкі: т.т. Каваленя, Калодкін, Канвісараў, Рынейскі.

Былі дасьледаваны 55 кіл. па р. Прыпяці ад Мазыра ўніз да вусьця р. Славечны. Тут былі выяўлены некалькі стаянак часоў нэоліту і бронзы. Зарэгістравана некалькі гарадзішчаў і груп кургаоў жалезнага пэрыяду. Каля мястэчка Юравічы, Мазырскай акругі, знойдзена стаянка часоў палеоліту з рэшткамі маладога мамаята і крамнёвымі прыладамі чалавека. Гэта стаянка лядніковай эпохі адносіцца да т. з. арыньяку, аднэй з верхня-палеалітычных культур. Гэта ёсьць 2-я стаянка першабытнага чалавека, выяўленая на Беларусі (першая стаянка—у Бердыжы, Гомельскай акр.).

Абсьледваньне абодвых берагоў р. Бярозы, пачынаючы ад г. Барысава да м. Сьвіслач, дала шмат цікавага матар'ялу. Тут былі выяўлены стаянкі чалавека часоў нэоліту і бронзы, дасьледавана 18 гарадзішчаў са знакамі культуры раней славянскай, якая мае сувязь з [культурамі гарадзішчаў каля Банцарышчаўны, Вілейшчыны і Ковеншчыны.

У Койданаўскім раёне т. т. Ляўданскі і Шпілеўскі дасьледвалі 2 гарадзішчы і некалькі груп кургаоў. Культура гарадзішчаў да-славянская і славянская. Тут была знойдзена лепная пасуда да-славянскай культуры. У курганох заўважаецца пераважна трупаспаленьне. Адносяцца яны да Крывіцкай культуры 10-11 ст. ст.

Па Случы-Ўрэчча былі абсьледаваны шляхі каленізацыі краю-славянамі. Каля в. Княжава-Магіла былі раскопаны 15 курганаў з пахаваньнем на грунце, у гэтых курганох былі знойдзены розныя рэчы і аздобы.

На абодвых берагох р. Случы каля в.в. Міцяевічы, Стамагілы і інш. абсьледаваны 40 курганоў дрыгвіцкага тыпу. Тут курганы насыпаны на месцы стаянак часоў нэоліту і бронзы, на палёх пахавальных вурнаў. У курганох часта трапляюцца розная пасуда і прылады.

Такія стаянкі і палі пахавальных вурнаў знаходзяцца і каля м. Старобіна.

На левым беразе р. Случы раскопаны 6 курганаў, дзе раней былі знойдзены грыўны. Тут выяўлены сьляды ўплыву паўднёвай курганнай культуры (драўлянскай).

Раскопка гарадзішча ў м. Тураве выявіла славянскае яго пахаджэньне. Ніжэйшы пласт гарадзішча мае значныя праслойкі з рыб'яй луской, асятрыны (?) і інш. Гэта сьведчыць аб тым, што ў першы пэрыяд жыцьця гарадзішча насельнікі яго займаліся рыбарствам.

Далейшае археолёгічнае вывучэньне м. Турава і яго ваколіц паказала, што дагістарычнае і гістарычнае жыцьцё яго праходзіла не на месцы сучаснага Турава, а на захад ад яго, на пясчаных градах.

Аднаначасова з археолёгічнымі дасьледаваньнямі і раскопкамі ўдзельнікі экспэдыцыі чыталі лекцыі насельніцтву. У часе гэтых лекцый дэманстраваліся сьвежа-здабытыя з курганоў і гарадзішчаў розныя рэчы матар'яльнай культуры і старажытнасьці, якія зьяўляюцца лепшымі прыкладамі таго, як чалавек тварыў сабе багоў, тварыў рэлігію. Гэтыя лекцыі зьяўляліся лепшай антырэлігійнай прапагандай, лепшым доказам таго, што не багі кіруюць людзьмі, а што людзі робяць сабе багоў.

Лекцыі ўсюды выклікалі вялікую зацікаўленасьць.

Арганізавана 16 буйных калгасаў.

Згодна вестак Белкалгассаюзу за апошні час у Бабруйскай, Магілеўскай і Гомельскай акрузе арганізаваны 16 новых буйных калгасаў; плошча кожнага 2000-4000 гэктараў. Кожны калгас ахапіў каля 150 сялянскіх сем'яў.

Сяляне Пуцімокага с-с. Магілеўскай акругі на 75 проц. уступілі ў калгасы.

На ўсебеларускай спартакіядзе сялянскіх фізкультурнікаў.

Учора працягваліся спаборніцтвы па розным галінам спорту.

У выніку спаборніцтваў хаджэньню па брэўну 1-ае месца заняў Магілёў, 2-ое Гомель.

Гульні ў гарадкі Полацак—Орша скончыліся 2:0 на карысьць Полацку.

Спаборніцтвы па баскет-болу мужчынскіх каманд Гомель—Мозыр скончылася перамогай гомельчан. У перацягваньні канату гэтых каманд першынства ўзяў Гомель.

Спаборніцтвы працягваюцца.

У Белсельбанку

Пашырэньне азімага кліну

Белсельбанкам адпушчана Белсельтрэсту на пашырэньне кліну азімых пасеваў 100000 руб.

Пабудова каўбаснае фабрыкі.

Белмясгандаль атрымаў ад Белсельбанку 30.000 руб., грошы гэтыя прызначаюцца на пабудову каўбаснай фабрыкі ў Менску.

У гуматрэсьце.

На сэзон 29-30 г. г. менскім гандлёвым аддзяленьнем гуматрэсту СССР будзе атрымана для Беларусі 63000 пар галёш. Галёшы будуць разьмеркаваны наступным чынам: беларускай каапэрацыйнай сетцы—35.000 пар. і Дзяржгандлю—25500 пар.

Галёшы будуць завезены на працягу часуз жніўня 1929 г. па травень 30 г.

* * *

Гуматрэстам атрымана вялікая партыя заказаў на тэхнічныя вырабы ад фабрык і заводаў і ад дзяржаўнага гандлю.

Радыёфікацыя Менску.

Культаддзел ЦСПСБ заключыў дагавор з Радыё-Цэнтрам на радыёфікацыю Менску.

Будзе ўтвораны трансляцыйны вузел на 3000 „точек“, з якіх 1000 для гучнагаварыцеляў, а рэшта—для слухавых трубак. Для ўстаноўкі гучнагаварыцеля або слухавых (тэлефонных) трубак ня трэба будзе мець складанай апаратуры, досыць толькі ўключыць у штэпсель і можна ўжо слухаць радыё-перадачы.

У першую чаргу будуць радыё-фікаваны клюбы і чырвоныя куткі. За карыстаньне гучнагаварыцелям з клюбаў будзе ўзімацца плата ў 3 руб. штомесяц, а з рабочых і наогул працоўных на іх кварталах—па 2 руб. у месяц. За слухавыя трубкі плата ўстаноўлена ў 1 руб. штомесяц.

Работа па радыёфікацыі ўжо распачалася.

Вытворчая канфэрэнцыя харчавікоў.

18 верасьня ў Менску адбудзецца вытворчая канфэрэнцыя рабочых харчавой прамысловасьці. Канфэрэнцыя абгаворыць кантрольныя лічбы харчавой прамысловасьці на 1929-30 год. Шмат увагі ў працы канфэрэнцыі будзе зьвернута на абгаварэньне ходу сацыялістычнага спаборніцтва, а таксама на праверку працы вытворчых нарад.

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь“ для рэцэнзіі наступныя часопісы.

1. „Печать и революция“ кн. №[illegible] Журнал літаратуры, мастацтва, крытыкі і бібліяграфіі. Стар. 131, цана 1 руб. 25 кап.

Дзяржаўнага Выдавецтва, Масква.

2. „Бальшавік Беларусі“ № 6. Часопіс палітыкі і практыкі партыйнай працы. Орган ЦК КП Стар. 80, цана 35 кап.

3. „Каапэрацыя“ БССР № 8. Двухтыднёвы орган капэрацыйных цэнтраў Белсельбанку і Усекабанку. Стар. 3[illegible] цана 25 кап.

Апавяшчэньні

1) Іспыты для паступаючых у Беларускі Камунівэрсытэт будуць праводзіцца 22-га па 26 жніўня г.г.

Усе т.т., паступаючыя ў Камвуз, павінны зьявіцца ў тэрміны, паказаныя асабістым паведамленьні кожнаму.

2) 22-га жніўня, а 10 гадз. раніцаю, у памяшканьні Камвузу адбудзецца нарада ўсіх выкладчыкаў, асьпірантаў і навуковых працаўнікоў Камвузу ў зьвязку з пачаткам навучальнага году. Зьяўка абавязкова.

Ад біржы працы.

Камісія па чыстцы беспрацоўных Менскай Б|Працы даводзіць да ведама рабочых і служачых і ўсіх беспрацоўных, што першае пасяджэньне камісіі адбудзецца 21 жніўня г/г., а 7 гадзіне ў зале Б. Працы (другі паверх). На гэта пасяджэньне павінны зьявіцца беспрацоўныя наступных кваліфікацыі: 1) Бухгальтэры 2) Рахункаводы, 3) Статыстыкі і 4) с[illegible]чыкі, якія павінны мець на руках дакуманты: аб працы па найму, сяброўскія кніжкі (сябры саюзу) і іншыя дакуманты аб сацыяльным становішчы.

САД АСЬВЕТЫ.

— Сёньня кіно „Млын на ўзьлесьсе“. Пачатак а 9 з пал. гадз.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР—КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Серада, 21-га жніўня
ПРЭМ'ЕРА
„БЕЛАЯ МОЛЬ“ у 3 дзеях Ашкіназі.
ПАЧАТАК А 8 з пал. ГАДЗІНЕ.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71.
ВЯЛІКАЯ ФРАНЦУСКАЯ ПАСТАНОЎКА
„ДРУГІ ШЛЮБ“
ДРАМА Ў 8 ЧАСТКАХ.
Пачатак 1-га а 9 гадзіне. ІІ-га 10 г. 30 хв.

1-Ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР“.
„ЯНКА І МСЬЦІВЕЦ“.
Штодня 2 сэансы: у 3 з паловай і 5 гадзін.
Каса ад 2-х гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЯ».
З аўторка 20 жніўня
сусьветны комік МОНЦІ БЭНКС у лепшай камэдыі сэзону
„ЛЕТАЮЩЕЕ СЧАСТЬЕ“
у 7 ЧАСТКАХ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.
АД АЎТОРКА, 20 ЖНІЎНЯ. ПРЭМ'ЕРА.
ДА ЗАЎТРА
КІНО-АПОВЕСЬЦЬ У 7 Ч. ВЫТВОРЧАСЬЦЬ БЕЛДЗЯРЖКІНО.
Пачатак роўна а 7 з пал. гадз. Каса—ад 6 гадз.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ
З прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень
„ГОРНАЯ БАЛЯДА“.
Драма ў 7 частках з пралёгам.
Пачатак а 7 гадз. 15 хв. Каса а 6 г.

Менск, дзяржаўная друкарня